№ 20 (378) 28 траўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы



### Эўрапейскае турнэ дэмакратаў

Брусэль—Бэрлін.

старонка 3

### Масоны супраць Беларусі

Новыя заявы Эдуарда Скобелева.

старонка 5

### Аляксандар Памідораў

Як файна жыць непрадказальна!



старонкі 8–9

### Яны працуюць з раньня да ночы

Пакаленьне «CD».

старонкі 6–7

### «Не выявіў ролі камуністаў

у артыкуле па гісторыі царквы». Новая цэнзура ў Акадэміі навук.

старонка 4

### Чый апостал і геній?

Ён не пачуваўся часткаю гэтага народу, а пасьля «гісторыі» са сьмерцю Марыі Залускай, сымпатыі да яго ў сэрцах віленскае публікі зусім астылі, але ён трапіў у беларускія мастакі, апосталы і нацыянальныя геніі.

старонка 11

### Беларускі гатэль «Лямбэрт»

Лёлік Ушкін пра субкультуру ўпырхлікаў.

старонка 16

# Моладзь паказала як умее змагацца



ЮРАСЬ ДЗЯДЗІНКІН

Шляхецкі сойм Маладога фронту. Старонка 4.

# Геніяльны Скрыпка



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Супольны канцэрт «Вопляў Відаплясава» і «Крамбамбулі» стаў адной з самых яскравых культурных падзеяў вясны. Алег Скрыпка зладзіў у «Казе» лякальны энэргетычны выбух: добрыя каталікі круцілі пінжакі над галовамі, бальзакаўскія жанчынкі скакалі як студэнткі — уявіце, што выраблялі студэнткі. Скрыпка нам блізкі і родны, бо закранае ў душы пракаветныя струны. Адначасова вучачы эўрапейскім падыходам да працы. У «ВВ» калясальны досьвед, яны не згубіліся б і ў адным канцэрце зь «U2». Скрыпка папросту абазначыў наступную прыступку, на якую будуць узнімацца нашы артысты.**

**Старонка 12.**

# Канец настальгіі па СССР

**У грамадзтве сфармавалася новая большасьць — прыхільнікаў незалежнасьці і далучэньня да Эўразьвязу.**

Расейскія сацыёлягі з цэнтру ВЦІОМ, агучваючы вынікі сваіх дасьледаваньняў напярэдадні ялцінскага саміту, не прыхоўвалі намеру даказаць, што ідэя інтэграцыі славянскіх рэспублік былога СССР карыстаецца вялікай папулярнасьцю сярод іх жыхароў. Аднак апытаньне зафіксавала адваротныя тэндэнцыі.

Нягледзячы на хітрую фармулёўку пытаньня, амаль па 30% беларусаў вызначылі прыярытэтам жыцьцё ў незалежнай краіне і інтэграцыю ў Эўропу. У суме «незалежнікаў» (А) і «праэўрапейцаў» (Б) набіраецца 56% проці 32% у суме «панславістаў» (В) і «прасавецкіх» (Г). Для параўнаньня: ва Ўкраіне зь яе эканамічным бязладзьдзем гэтая прапорцыя складае ўсяго 47:42, што ставіць пад сумнеў шанцы Віктара Юшчанкі ў прэзыдэнцкай гонцы.

**Працяг на старонцы 3.**

# Конкурс

## для маладых журналістаў-аналітыкаў

Беларускі ПЭН-Цэнтар пры падтрымцы газэты «Наша Ніва», часопісаў «Arche» і «Палітычная сфера» ды Беларускай асацыяцыі журналістаў

абвяшчае конкурс на найлепшы аналіз

## «Выбары-2004: шанцы і прагнозы».

Пераможцаў чакаюць прызы, дыплёмы і майстар-клясы.

На конкурс прымаюцца артыкулы памерам да 15 тыс. знакаў. Працы дасылайце на электронны адрас pen@pen.unibel.by або на адрас: а/с 18, 220050, Менск, з пазнакай «На конкурс». Апошні тэрмін падачы — 25 чэрвеня.

Журы конкурсу: Валер Булгакаў, Андрэй Дынько, Андрэй Казакевіч, Віталь Сіліцкі.

# Адказ на выклік ночы




Што вы будзеце рабіць, калі прыйдзеце да ўлады? Палітык Сяргей Салаш даў адказ на гэтае пытаньне ў выглядзе кнігі «Барысаў і рэгіён: стратэгія разьвіцьця». Першы ў краіне такога кшталту стратэгічны праект разьвіцьця рэгіёну напісаны па-беларуску. Разам з Салашам над ім працавалі эканамісты Зьміцер Бабіцкі ды Ўладзімер Валетка. Праграма прагматычная і жыцьцёвая ў частцы, якая датычыць галоўнай апоры незалежнага грамадзтва, — сацыяльнай сфэры й прыватнага бізнэсу, і ідэалістычная там, куды нага апазыцыі пакуль што не ступала, — у сельскай гаспадарцы. Напрыклад, вядзецца гаворка пра рэстытуцыю зямлі ўласьнікам да 1917 г. Зрэшты, «выкананьне хаця б паловы пастаўленых мэтаў зробіць Барысаўшчыну адным з найбольш прывабных куткоў Беларусі», — мяркуе прафэсар БДЭУ Павал Гейзьлер.

Каб атрымаць кнігу, пішэце на salas@tut.by.

# Я люблю ліцэй

Новая генэрацыя заявіла пра сябе год таму ў першым дыску. Другі дыск больш прафэсійны, больш густоўна аздоблены, дыхтоўна запісаны і можа прэтэндаваць ня толькі на тое, каб прадстаўляць ліцэйскую самадзейнасьць. Сур'ёзная руплівая праца таленавітых людзей, цікавая з музычнага гледзішча. Адна з разынак альбому — «Гатэль «Беларусь» (прывітаньне «Іглз») у выкананьні паэта Андрэя Хадановіча. Самі ліцэісты сьпяваюць пра лёс, пра каханьне, пра сум і радасьць, нязломнасьць і аптымізм — у гэтым выяўляецца знакаміты ліцэйскі дух. Найбольш яскрава ліцэісты даводзяць сваю таленавітасьць у песьнях «Не хачу паміраць», «Ніткі», «Мне сумна». Гэтыя кампазыцыі някепска глядзеліся б і на якой «генэральскай» складанцы.

Ёсьць за гэтымі ломкімі і часам няўпэўненымі галасамі будучыня.

**Сяргей Будкін**




Веру ў цябе!

«БМА-груп»; Беларуская служба Польскага радыё, 2004.

ЦЫТАТА

# Інфармацыя гэта маніпуляцыя

**Міхаіл Падаляк, рэдактар газэты «Время»,** у праграме «Праскі акцэнт» радыё «Свабода»: «На самай справе маніпуляцыя — гэта заўсёды дарога з двухбаковым рухам. Маніпуляцыя — гэта ўзаемны працэс. Увогуле, інфармацыя — гэта сыстэма маніпуляваньня».



PHOTO.BYMEDIA.NET

**Міхаіл Падаляк (справа).**

ДЗЕ ВАРТА БЫЦЬ

## Батанічны сад: новая экспазыцыя

3 чэрвеня новы сэзон у Батанічным садзе адкрыецца экспазыцыяй «Кветкі сьвету», краскі для якой перадалі ў тым ліку жонкі замежных дыплямататаў, акрэдытаваных у Беларусі. На ёй зацьвітуць і расьліны, папулярныя ў Беларусі ў XVIII—XIX ст.

Іншыя ідэі «Дзе варта быць» — **на старонцы 13.**



ГАЗЭТНЫ ШАПІК

## Прусакі разьбегліся

«Калі ў 2001 г. прусакі засялялі 17,1% плошчы сталіцы, дык у 2002 г. гэты паказчык скараціўся амаль удвая. А летась пабітыя ўсе рэкорды — 7,2%!» — піша газэта «Рэспубліка».

# Арсеньнева вярнулася ў Вільню



**Алесь Шатэрнік, Хведар Нюнька і Пятро Краўчанка падчас імпрэзы**

У Вільні на будынку былой Беларускай гімназіі зьявілася мэмарыяльная дошка Натальлі Арсеньневай.

«Апошні раз быў у Вільні ў 1989-м, падчас рэвалюцыі. Поўны стадыён народу, літоўцы патрабуюць незалежнасьці, і раптам зьяўляецца здаровы вайсковы верталёт, а зь яго на галовы людзям лятуць лістоўкі з заклікам вяртацца ў СССР», — згадвае скульптар Алесь Шатэрнік, які стварыў мэмарыяльную дошку. У Вільню ён вярнуўся праз пятнаццаць гадоў — якраз на 15-годзьдзе Таварыства беларускай культуры. Да гэтай падзеі й было прымеркаванае ўсталяваньне дошкі.

Імпрэза 22 траўня сабрала беларусаў з усяго рэгіёну: былі гісторык Алег Латышонак зь Беластоку, мастак Вячка Целеш з Рыгі, Беларусь прадстаўлялі Ўладзімер Арлоў, Алег Трусаў, Пятро Краўчанка — адзін з фундатараў, Анатоль Белы — ініцыятар ушанаваньня паэткі.

Рыхтуючы месца для мэмарыяльнай таблічы, давялося зьняць шыльду нямецкай фірмы, што раней месьцілася ў будынку. Цяпер будынак былой гімназіі ў Базылянскіх мурах стаіць пусты і, паводле словаў Уладзімера Коласа, каб засяліць туды Беларускі ліцэй, трэба толькі ініцыятыва.

**Сяргей Мікулевіч**

ШТО Ў СЬВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Прызначэньні: адзін стары, тры новыя

Аж тры новыя твары зьявіліся ў першым шэрагу беларускага ўраду. Гэта Ганна Дзейка, міністарка падаткаў і збораў (раней намесьніца міністра), Браніслаў Сіваў, кіраўнік багатага «Белнафтахіму» (раней дырэктар полацкага «Шкловалакна») ды Леанід Русак, міністар правальнае сельскае гаспадаркі (былы старшыня Менскага райвыканкаму). У рамках перастасоўкі старых, родам яшчэ зь Вярхоўнага Савету XII скліканьня кадраў Івана Бамбізу зь «Белнафтахіму» перакінулі здабываць салярку ў якасьці віцэ-прэм'ера ўраду ў аграрных пытаньнях.

## Кантракты: цяпер і для студэнтаў

У Беларусі плянуецца ўвесьці кантрактную сыстэму падрыхтоўкі студэнтаў на ўсіх формах навучаньня. Гэта прадугледжвае праект новага закону «Пра вышэйшую адукацыю». Калі выпускнік не адпрацуе пэўнага тэрміну па разьмеркаваньні, ён будзе мусіць вярнуць дзяржаве грошы за адукацыю. Праект, напэўна, выкліча скаргі ў Канстытуцыйны суд. Вядома, што грамадзяне маюць права на бясплатную адукацыю, якая фінансуецца з падаткаў.

## Мінфін: падаткі зьнізяцца на 2%

У 2005 г. урад мае на 2% скараціць падатковую нагрузку на рэальны сэктар эканомікі. Паводле слоў першага намесьніка міністра фінансаў Анатоля Сьвяржа, прапануецца скасаваць 4-працэнтны «чарнобыльскі» падатак і скараціць падаткі з заробку.

## Сідорскі ў Італіі

Прадстаўнічая беларуская дэлегацыя ў складзе прэм'ера, трох міністраў і дырэктараў найбуйнейшых заводаў наведвае Мілян. Прадстаўнікі італьянскага ўраду ня будуць сустракацца зь Сяргеем Сідорскім.

## Атлусьценьне: 52% беларусаў

52% беларусаў маюць залішнюю вагу — гэта зьвесткі Міністэрства аховы здароўя. Дарэчы, самы тоўсты чалавек у краіне важыць 175 кг.

## Мітынг памяці Багдановіча

Санкцыянаваная акцыя прайшла ля помніка паэту 25 траўня, у дзень ягонай сьмерці. Выступалі пісьменьнікі й музэйнікі, сьпяваў хор БНФ «Адраджэньне», а навучэнцы Беларускага ліцэю чыталі вершы. Пасьля ў Петрапаўлаўскай царкве была паніхіда.

## Карчміт памёр у Нямеччыне

Дырэктар агракамбінату «Сноў» Міхаіл Карчміт, які перад выбарамі 2001 г. стаў Героем Беларусі, памёр на 56-м годзе жыцьця ў Нямеччыне, дзе лячыўся. Магчымасьць лячыцца ў Нямеччыне маюць высокія дзеячы беларускай адміністрацыі. Сярод апошніх, хто выкарыстоўваў такую магчымасьць, была, паводле неправераных зьвестак, міністарка аховы здароўя Людміла Пастаялка.

## Палякі тужаць па застоі

Які лідэр зрабіў пасьля вайны для Польшчы найбольш? Валэнса? Мазавецкі? Квасьнеўскі? Не. Эдвард Герак, лідэр ПАРП у 70-х! Так мяркуе палова палякаў. Гэта выявіла апытаньне каналу TVN і «Gazety Wyborczej». Грамадзтва падзеленае, піша ў камэнтары да вынікаў «Gazeta». Камуністычнай настальгіі паддаюцца людзі старэйшыя, а між моладзі аднaзначна наперадзе Валэнса.

**БТ, паводле БелаПАН**

# Эўрапейскае турнэ дэмакратаў

Дваццаць лідэраў беларускае апазыцыі пабывалі зь візытам у Брусэлі й Бэрліне. Прадстаўнікі дэмакратычных сілаў сустрэліся зь найвышэйшым прадстаўніком Эўразьвязу па замежнай палітыцы й абароны Хаўерам Салянам, з камісарам па пытаньнях пашырэньня Эўразьвязу Гюнтэрам Фэргойгенам, з генэральным дырэктарам Эўракамісіі па пытаньнях пашырэньня Эўразьвязу Энэко Ландабуру і Томам Кітам, дзяржаўным міністрам Рэспублікі Ірляндыя, якая цяпер старшынюе ў Эўразьвязе.

У Брусэль былі запрошаныя прадстаўнікі Народнай кааліцыі «5+», групы «Рэспубліка», Эўрапейскай кааліцыі «Свабодная Беларусь», незалежнага грамадзтва (рэдактар «БДГ» Пятро Марцаў). Генэральны дырэктар Эўракамісіі па праблемах пашырэньня Эўразьвязу Энэка Ландабуру зрабіў даклад Хрыстаса Пургурыдэса і выказаў заклапочанасьць сытуацыяй ды імкненьне паўплываць на афіцыйныя ўлады дзеля таго, каб беларускі народ мог на выбарах зрабіць свабодны выбар. Э.Ландабуру, баск па нацыянальнасьці, выказаў асабістую падтрымку беларускай апазыцыі: «Я браў удзел у змаганьні з дыктатурай Франка і дужа добра разумею вашу сытуацыю».

Том Кіт зазначыў, што Эўразьвяз будзе рабіць усё магчымае, каб, не зважаючы на дзеяньні афіцыйнага Менску, не ізаляваць беларускага народу ад Эўропы. «Мы ня хочам супрацоўнічаць з вашым урадам, але гэта датычыць толькі беларускіх уладаў, а не беларускага народу», — сказаў Кіт.

Беларускія палітыкі заклікалі міжнародную супольнасьць павялічыць увагу да нашай краіны. Мікола Статкевіч заявіў, што пры дэмакратычным ладзе Беларусь зможа прэтэндаваць на сяброўства ў Эўразьвязе і пры зьмене рэжыму Аляксандра Лукашэнка «дзьверы ЭЗ павінны быць адчыненыя для Беларусі». Каардынатар руху «Зубр» Уладзімер Кабец заклікаў спрасьціць працэдуру выдачы візаў для простых беларускіх грамадзянаў, асабліва для моладзі, якая павінна вольна перасоўвацца па Эўропе. Лідэр «Рэспублікі» генэрал Валер Фралоў узьняў пытаньне пра арышт Міхаіла Марыніча. Ірына Красоўская заклікала прадстаўнікоў бэльгійскага МЗС падтрымаць ініцыятыву сваякоў зьніклых у Беларусі вядомых людзей і распачаць у Бэльгіі працэсы супраць некаторых высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў, якіх падазраюць у забойствах па палітычных матывах.

«Будучыя парлямэнцкія выбары даюць магчымасьць беларускім уладам паказаць сваю гатовасьць развіваць дэмакратыю і агульнаэўрапейскія каштоўнасьці», — такую заяву зрабіў Хаўер Саляна падчас сустрэчы з дэлегацыяй беларускай апазыцыі.

Аляксандар Лукашэнка і ягоныя чыноўнікі ня маюць магчымасьці сустракацца ў Эўропе на такім высокім узроўні і адстойваць інтарэсы свайго народу. Запрашаючы прадстаўнікоў беларускай апазыцыі ў Брусэль, кіраўніцтва ЭЗ адзначыла, што Эўразьвяз не практыкуе сустрэчаў з апазыцыяй. Беларускі выпадак — вынятак, які падкрэсьлівае, што ЭЗ разглядае Беларусь як пэрспэктыўную для дэмакратыі краіну.

> Гюнтэр Фэргойген: Пасьля дэмакратызацыі Беларусь будзе мець права ставіць пытаньне пра далучэньне да Эўразьвязу.



**На сустрэчы з Хаўерам Салянам зьлева направа: Валер Фралоў, Уладзімер Парфяновіч, Уладзімер Кабец, Анатоль Лябедзька.**

Гюнтэр Фэргойген заявіў, што галоўная ўмова ўступленьня Беларусі ў Эўразьвяз — дэмакратызацыя. Паводле словаў камісара ЭЗ, як толькі ў Беларусі будуць аднолены прынцыпы дэмакратыі, дачыненьні нашай краіны з Эўразьвязам значна палепшаюць. «Ніхто ня ставіць пад сумнеў тое, што Беларусь — гэта эўрапейская краіна і мае права ставіць пытаньне аб сваёй прысутнасьці ў Эўразьвязе», — сказаў Фэргойген.

Апазыцыянэры ехалі ў Брусэль ня толькі па словы падтрымкі. Задача-максымум была — знайсьці фінансы для зачыненых арганізацый і навучальных установаў, СМІ. Калі справа абмяжуецца спагаднымі ўсьмешкамі Саляны, апазыцыі ўвосені прыйдзецца скрушна.

**Аркадзь Шанскі, Сяргей Радштэйн**

## Анатоль Лябедзька: «Галоўнае, каб Беларусь ня выпала з кантэксту»

**Кіраўнік Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатоль Лябедзька па дарозе з Брусэлю ў Бэрлін адказаў праз тэлефон на пытаньні «НН».**

**«НН»: Якія першыя вынікі паездкі апазыцыі ў Брусэль?**

**А.Л.:** Перад паездкай мы ставілі некалькі мэтаў. Па-першае, узмацніць увагу Эўразьвязу да Беларусі, да пэрспэктываў Беларусі як эўрапейскай краіны. Па-другое, паказаць палітычны аптымізм, імкненьне апазыцыі да яднаньня. Па-трэцяе, мы везьлі свае прапановы наконт стратэгіі й тактыкі Эўрапейскага Зьвязу ў дачыненьнях зь Беларусяй. Лічу, што ўсіх гэтых мэтаў нам удалося дасягнуць.

**«НН»: Ці азначае ваша «мэта №2», што апазыцыя вернецца з Брусэлю аб'яднанай?**

**А.Л.:** Гэта перабольшаньне, што апазыцыя перажывае нейкую пару міжусобіцаў. У нас аднолькавыя мэты і задачы, мы аднолькава ацэньваем сытуацыю. Розьніца толькі ў тактычных падыходах.

**«НН»: Якой рэакцыі на гэтую паездку вы чакаеце ад уладаў?**

**А.Л.:** Нас ня вельмі цікавіць, што думае наконт гэтага Аляксандар Лукашэнка, — гэта другаснае. Галоўнае, каб Беларусь ня выпала з агульнаэўрапейскага кантэксту.



# Балтыка чакае

«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры.
Каб узяць удзел у конкурсе, дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі. Падпісны індэкс 63125. Падпіску прымаюць на любой пошце, а ў Менску — і на шапікі «Белсаюздруку» ды ў прыватным агенцтве «Эй Бі ПрэсСэрвіс».
Цана на месяц — 2580 рублёў на поштах або 1800 рублёў на шапікі «Белсаюздруку». Гэта нашмат таньней, чым уразьдроб.

Дык падпісвайся!

# Канец настальгіі па СССР

**Працяг са старонкі 1.**

Беларускую частку апытаньня ажыцьцяўляла рэспэктабэльная сацыялягічная служба «Новак». Зьмены ў сьвядомасьці беларусаў фіксавалі апошнім часам і іншыя сацыёлягі. Напрыклад, НІСЭПД у сваім апошнім зандажы выявіў, што абсалютная большасьць беларусаў (у суме 57%) выводзіць карані нацыянальнае дзяржаўнасьці з ВКЛ і БНР, і абсалютная меншасьць — з БССР і РБ. Цікава, што дзьве гэтыя лічбы — 56% прыхільнікаў эўраінтэграцыі — ...незалежнасьці і 57% людзей зь несавецкай гістарычнай сьвядомасьцю — амаль супадаюць.

Вынікі фэнамэнальныя, калі ўлічыць узмацненьне «ідэалягічнае працы» і нэўтралітэт незалежных СМІ — напрыклад, у іх практычна не было нэгатыўных ацэнак факту стварэньня Эўразіяцкае эканамічнае прасторы. Нешта падобнае адбывалася ў 70—80-х у кантраляваных Савецкім Саюзам краінах Цэнтральнай Эўропы.

Што абумоўлівае зьмены ў сьвядомасьці? Найперш, фактар геаграфіі і замежных паездак. Доля беларусаў, якія бывалі ў краінах Эўразьвязу, у разы большая, чым сярод жыхароў Расеі й Украіны. Акрамя таго, эканамічны рост вывеў грамадзтва са стану трывожнае няўпэўненасьці, характэрнага для 90-х. Нарэшце, палітычныя сілы, што выступалі пад лёзунгамі інтэграцыі з Расеяй, цяпер паглынутыя непапулярнымі ідэямі трэцяга тэрміну і прыватызацыі дзяржаўнае маёмасьці.

Можна чакаць, што беларускія палітыкі стануць усё ахвотней выкарыстоўваць эўрапейскую карту. Адначасова нават звычайныя візавыя абмежаваньні становяцца эфэктыўным мэтадам ціску на лукашэнкаўцаў.

**Мікола Бугай**



**Ялцінская пальма ці брусэльская капуста?**

**Цяпер шмат якія краіны імкнуцца да аб'яднаньня, іншыя, наадварот, да самастойнасьці. Калі б вы маглі выбіраць, дык дзе б вы хацелі жыць?**

| | Беларусь | Расея | Украіна |
|---|---|---|---|
| А У сваёй уласнай краіне | 28 | 51 | 32 |
| Б У аб'яднанай Эўропе | 28 | 11 | 15 |
| В У аб'яднаным саюзе Беларусі, Расеі і Ўкраіны | 17 | 9 | 23 |
| Г У зноў аб'яднаным СССР | 15 | 19 | 19 |
| Д У Садружнасьці незалежных дзяржаў | 7 | 7 | 11 |
| Е Цяжка адказаць | 5 | 4 | 0 |

# Шляхецкі сойм «Маладога фронту»

**Да 5 сьнежня старшынём «Маладога фронту» застаецца Павал Севярынец. Нават кулакі не дапамаглі ўдзельнікам арганізацыі вызначыць новага лідэра.**

Сойм 23 траўня быў прыпынены праз бойку, якая ўзьнікла ў залі. Сутычка ўзьнікла ў дружыны з дэлегатам сойму і дэпутатам Мастоўскага райсавету Алесем Зарамбюком. З боку абодвух кандыдатаў на пасаду старшыні — Сержука Бахуна і Зьмітра Дашкевіча — сабралася аднолькавая колькасьць дэлегатаў, што стварыла напружаную атмасфэру. Нядзіўна, што зьезд прайшоў зь нечуваным аншлягам.

Ужо на другі дзень абодва кандыдаты — берасьцеец Бахун і гарадзенец Дашкевіч — са сваімі камандамі мірна сабраліся на аргкамітэт, прызначылі дату сойму на 5 сьнежня і пачалі падрыхтоўку. Кіраваньне арганізацыяй будзе ажыцьцяўляцца па чарзе 25 дзён кожным з кандыдатаў, а фармальна старшынём арганізацыі застаецца Павал Севярынец.


ЮРАСЬ ДЗЯДЗІНКІН

Алесь Зарамбюк (справа) падтрымліваў Зьмітра Дашкевіча.

«У нас дэмакратыя», — так растлумачыў Павал Севярынец нядзельную бойку на сойме і параўнаў гэта з шляхецкімі соймамі, дзе спрэчкі вырашалі пры дапамозе зброі. Севярынец кажа, што МФ заўсёды меў «трошкі хуліганскі» імідж, але былі расколы больш глыбокія, ідэалягічныя. Гэтым разам праграмы ў абодвух кандыдатаў амаль ідэнтычныя. На выніку выбараў у сьнежні, напэўна, паўплывае тое, ці здолее хтосьці з кандыдатаў на пасаду старшыні прайсьці ў палату прадстаўнікоў. Сам Севярынец кажа, што падтрымае любога з кандыдатаў.

Пра небясьпеку расколу і неабходнасьць захаваць адзінства казалі на сойме літаральна ўсе выступоўцы — Станіслаў Шушкевіч і Валер Фралоў, які намагаўся выступаць па-беларуску. Прарочы раскол «Маладому фронту» толькі Вячаслаў Сіўчык, «хросны бацька» арганізацыі.

Абодва кандыдаты, Зьміцер Дашкевіч і Сяржук Бахун, афіцыйна беспрацоўныя. Зьміцер Дашкевіч — студэнт Віленскага пэдагагічнага ўнівэрсытэту, вядомы актыўным удзелам у вулічных акцыях. Сяржук Бахун — былы школьны настаўнік, мае 27 гадоў, а значыць, вылучацца можа толькі на два тэрміны. За Сержуком Бахуном падтрымка Сержука Лісічонка — міжнароднага сакратара арганізацыі.

Навучаны выбарамі 2001 г., «Малады фронт» гэтым разам вызначыўся з тым, якога кандыдата ён падтрымае на прэзыдэнцкіх выбарах 2006-га: ён павінен быць маладым рашучым палітыкам, незалежнікам, з досьведам барацьбы з рэжымам, які спавядае дэмакратычныя каштоўнасьці, хрысьціянскія прынцыпы і правацэнтрысцкую ідэалёгію, а таксама гатовы аднавіць нацыянальную сымболіку і рэальную дзяржаўнасьць беларускае мовы.

**Вераніка Дзядок**

## Рэпрэсіі і супраціў

18 траўня Наваполацкі гарсуд адхіліў скаргу **Зьмітра Салаўёва** на Наваполацкі гарвыканкам, які забараніў мітынг з удзелам прадстаўнікоў кааліцыі «5+». **Мікола Маркевіч** 18 траўня падаў у пракуратуру Гарадзенскай вобласьці скаргу на дзеяньні супрацоўнікаў абласнога УКДБ, якія наладзіліператрус у офісе гарадзенскага аддзяленьня ТБМ, забраўшы дакумэнты і аргтэхніку. **Аксане Новікавай** 18 траўня паведамілі, што яшчэ 10 траўня Менская транспартная пракуратура адмовіла ў хадайніцтве аб спыненьні яе крымінальнай справы: жанчыну абвінавачвалі ў паклёпе на Лукашэнку. Старшыня гомельскага абласнога жаночага ГА «Ініцыятыва» **Галіна Скараход** падала касацыйную скаргу на рашэньне райвыканкаму: упраўленьне юстыцыі выканкаму адмовіла арганізацыі ў рэгістрацыі па знойдзеным юрыдычным адрасе. 20 траўня ў Менску падчас раздачы газэты «Супраціў» былі затрыманы актывісты «Зубра» **Юлія Гарачка** і **Артур Гайдукевіч**: у пастарунку ў іх забралі газэты і прымусілі напісаць тлумачальныя запіскі. 21 траўня калектыў **Беларускага ліцэю** вырашыў спыніць спробы афіцыйна зарэгістравацца. Кіраўнік АГП **Анатоля Лябедзьку** 21 траўня дапыталі ў Менскай гарадзкой пракуратуры ў рамках крымінальнай справы пра паклёп на прэзыдэнта.

**АШ**

ARCHE
твой любімы часопіс

падпісны індэкс 00345
У новым «Arche» №2-2004 палітыка і культура:
Віталь Сіліцкі «Гістарычны выбар Лукашэнкі»
Юры Чавусаў «Цэнтры цяжару ідэалягічнае працы»
Аляксандар Надсан «Даведнікі — не паэзія»
Юрась Ліхтаровіч «Кароткі курс посткамунізму»
Андрэй Дынько «Між братняй Расеяй і мірнай Эўропай»
Сакрат Яновіч «Беларусь заўтра»
Пётра Садоўскі «Нататкі рэтраграда»
Кастусь Лашкевіч «Паміж спортам і палітыкай»
Сяргей Балахонаў «Пятнаццаць лішніх хвілін»
Мілан Кундэра «Эдуард і Бог»
Ані Жаліф «Беларуская прыгода»

# Курапацкая дружына



**Уладзімер Кішкурна: дзяжурствы ў Курапатах будуць працягвацца.**

Дзяжурствы ў Курапатах будуць працягвацца — пра гэта заявіў старшыня курапацкай дружыны Уладзімер Кішкурна. 22 траўня, калі павінна было адбыцца першае дзяжурства дружыньнікаў, у Курапаты прыбылі міліцыянты й паказалі пастанову Бараўлянскага сельскага выканкаму пра адмену ранейшага рашэньня ўтварыць дружыну. Падставай для гэтай адмовы стала тое, што ніводзін з удзельнікаў дружыны не жыве й не працуе на тэрыторыі сельсавету. «Яны паказалі «Прыкладнае палажэньне аб добраахвотных народных дружынах», дзе запісана, што дружыны фармуюцца паводле тэрытарыяльна-вытворчага прынцыпу. Я ім тлумачу, што «прыкладнае» — значыць, толькі ўзор, які можна мяняць. А яны мне: не, гэта закон, мы яго выконваем і нічога не мяняем», — расказаў У.Кішкурна пра свае перамовы з кіраўніцтвам сельвыканкаму.

Паводле словаў кіраўніка курапацкай дружыны, дзяжурствы ўсё адно будуць працягвацца. Толькі цяпер дружыньнікі ня будуць мець афіцыйнага статусу, а значыць, ня змогуць складаць пратаколы на хуліганаў.

**АШ**

# Не паказаў ролі камуністаў

## у артыкуле па гісторыі царквы

У Інстытуце гісторыі НАН Беларусі «зарубілі» зборнік артыкулаў па ваеннай гісторыі, падрыхтаваны да 60-годзьдзя вызваленьня Беларусі. Як стала вядома «НН», падчас падрыхтоўкі да друку кніга трапіла на вочы колішняму прэзыдэнту Акадэміі фізыку Мікалаю Барысевічу. Найбольш акадэмік Барысевіч не ўпадабаў артыкулу супрацоўніка аддзелу ваеннай гісторыі Інстытуту, аўтара «НН» Алега Гардзіенкі, прысьвечаны дзейнасьці Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы падчас другой сусьветнай вайны. Аўтару зрабілі закід, што ў працы не паказана роля камуністаў у змаганьні з фашыстамі, не адзначана колькасьць загінулых на фронце і ў партызанах.

Праўда, в.а. дырэктара Інстытуту гісторыі Мікалай Сташкевіч кажа, што зборнік не пусьцілі ў друк зусім зь іншых прычынаў: «Ён рыхтаваўся пад юбілей вызваленьня Беларусі, але там вельмі мала артыкулаў, прысьвечаных менавіта вызваленьню, — асноўны ўпор робіцца ўвогуле на ваенны гісторыю». Зборнік матэрыялаў па ваеннай гісторыі выходзіць ужо трэці раз, і сёлета ён упершыню меўся быць тэматычным: шумны юбілей даваў нагоду. І хаця зборнік ня меўся быць цалкам «вызваленскім», усё ж больш як палова артыкулаў прысьвячалася гісторыі Беларусі падчас другой сусьветнай вайны.

Паводле слоў М.Сташкевіча, пільнасьць да зьместу кнігі праявілі вэтэраны, якім зборнік быў адпраўлены на рэцэнзію: «Яны адзначылі, што не паказана роля партызанаў і франтавых часьцей у вызваленьні Беларусі, што большая частка артыкулаў не датычыць юбілейнай тэмы». Зь меркаваньнем вэтэранаў пагадзіўся і Прэзыдыюм Акадэміі, ад якога залежала фінансаваньне кнігі. Хто дасылаў зборнік навукоўцам-спэцыялістам, а вэтэранам? Ясна, што не супрацоўнікі аддзелу ваеннай гісторыі. Дый не М.Сташкевіч: ён якраз рэкамэндаваў зборнік Прэзыдыюму.

Кіраўнік Інстытуту гісторыі кажа, што артыкулы, прысьвечаныя непасрэдна вызваленьню, усё ж выйдуць. Але — толькі яны.

**АШ**

# Масоны супраць Лукашэнкі

**Эдуард Скобелеў: «Адзіная краіна, дзе масоны пакуль яшчэ не дабраліся да ўлады, — Беларусь. «Сыдзе Лукашэнка — будзе страшна», — лічыць аўтар «Арбузіка і Бябешкі».**


СЯРГЕЙ ШАПРАН

Сустрэча студэнтаў філялягічнага і эканамічнага факультэтаў ды факультэту філязофіі й сацыяльных навук Белдзяржунівэрсытэту з галоўным рэдактарам інфармацыйнага бюлетэню Адміністрацыі прэзыдэнта Эдуардам Скобелевым адбылася 20 траўня ў рамках «дня палітінфармацыі». Выступ Скобелева найбольш спадабаўся філёлягам: рэдактар прэзыдэнцкага бюлетэню выявіўся апантаным прыхільнікам «тэорыі змоваў», у параўнаньні зь ягонымі выкладкамі «Ківач Фуко» Ўмбэрта Эка — проста дзіцячая забаўка. На думку Скобелева, сьветам кіруюць масоны: яны стварылі і развалілі Савецкі Саюз («Эўразьвяз — гэта масонскае ўтварэньне. Ня думаю, што ён вытрымае выпрабаваньне часам»), іхныя амэрыканскія шпіёны ўзарвалі Чарнобыль, і цяпер масоны прызначаюць прэзыдэнтаў ды прэм'ер-міністраў («Чаму невядомыя людзі сталі ва ўрадзе Пуціна? Гэта людзі, вядомыя ў закрытых колах»). Адзіная краіна, дзе масоны пакуль яшчэ не дабраліся да ўлады, — Беларусь: «Сыдзе Лукашэнка — будзе страшна. Я пераканаўся, што роля асобы ў гісторыі — вызначальная». 4-тамовік твораў гэтай «вызначальнай асобы», паводле слоў Скобелева, мае ўбачыць сьвет праз паўтара месяца.

Праз 40 хвілінаў палова аўдыторыі сышла — «здаваць іспыты». Астатнім «прэзыдэнцкі рэдактар» патлумачыў, што Сталіна «незаконна ачарняюць», што «ў нас адбіраюць вайну. Перакрэсьлім вайну — і ў найноўшай гісторыі Беларусі нічога няма». Ненадоўга запыніўся на дзяржаўнай ідэалёгіі: «Нам важна захавацца беларускай нацыяй: патрыятызм, грамадзянскасьць і іншае. Нацыяналізм — гэта кепска, але нацыянальнае павінна быць». Мімаходзь патлумачыў эканамічныя мэханізмы: «За час кіраваньня Лукашэнкі ў нашу эканоміку было ўкладзена больш за 20 млрд інвэстыцыяў. Гэта зрабілі мы самі! Хто б нам даў столькі грошай? Калі б далі, дык толькі пад велізарныя працэнты». Пра сельскую гаспадарку: «Фэрмэры — гэта тупіковы шлях, гэта нам адмыслова падкінулі». Навука: «Уся сацыялёгія, дый іншая навука, якую вам выкладаюць, недакладная».

Такія ідэі выкладаюць на палітінфармацыях супрацоўнікі Адміністрацыі прэзыдэнта.

**АШ**

## Куды падзеліся піянеры?

Да 9 траўня, паводле газэты «Радзіма», у шаснаццаці дружынах Глушчыны налічвалася 653 піянеры, а пасьля Дня Перамогі іх зрабілася 872. Аднак 18 траўня тая самая газэта напісала: «Цяпер на Глушчыне 593 піянеры, пад канец мая іх колькасьць значна вырасьце і складзе каля 700». Куды ж падзеліся яшчэ 279 піянераў?

**Ігар Кірын, Глуск**

## Папаўненьне былых зэкаў

За чатыры месяцы году зь месцаў пазбаўленьня волі на Случчыну вярнулася 114 чалавек, зь іх 62 — па амністыі. Для параўнаньня: летась за такі тэрмін вышла толькі 58. Цяпер на прафуліку ў аддзеле ўнутраных спраў стаіць звыш за 1100 асобаў зь непагашанай судзімасьцю. Невыпадкова, што ў горадзе і раёне за першы квартал 2004 году зарэгістравана 335 крымінальных злачынстваў, прыкладна палову зь іх учынілі раней асуджаныя, якія ў большасьці маюць схільнасьць да злоўжываньня алкаголем і не жадаюць працаваць. Сярод іх ёсьць і жанчыны. Так, 22-гадовая Анжаліка З., вышаўшы па амністыі на волю 13 лютага, стала на ўлік, а ўжо праз шэсьць дзён была затрымана на гарадзкім рынку на гарачым: спрабавала ўкрасьці кашалёк.

## Падатак за кабэльнае ТБ

Разьлічваючыся ў пачатку траўня за паслугі кабэльнага тэлебачаньня за красавік, жыхарам гораду давялося выкласьці ня 2710 рублёў, як раней, а 3805, што абурыла перш за ўсё пэнсіянэраў. Павышэньня платы больш чым на 30% ніхто не чакаў. У мясцовым тэхна-гандлёвым цэнтры «Гарант», які мае непасрэднае дачыненьне да аплаты паслуг тэлебачаньня, засьведчылі, што рашэньнем аблсавету ад 21 студзеня прынята інструкцыя, згодна зь якой з 1 сакавіка ўведзены 10-працэнтны падатак, пад «прэс» якога трапілі і паслугі кабэльнага ТБ, а імі ў горадзе карыстаецца большасьць жыхароў.

## Зьнесьлі крыж, і гінуць людзі

Аналягаў аварыі, што адбылася нядаўна на кальцавой дарозе ля вёскі Лучнікі пад Слуцкам, супрацоўнікі ДАІ не прыгадаюць за апошні дзясятак гадоў. У сярэдзіне дня 39-гадовы кіроўца аўтамашыны «Фальксваген-Джэта» Е., у салёне якой сядзела чацьвёра пасажыраў, выехаў на паласу сустрэчнага руху і сутыкнуўся на хуткасьці з «Аўдзі-100», за рулём якой быў 26-гадовы К., настаяцель царквы зь вёскі Высокая Гара Бярэзінскага раёну, які ехаў з жонкай і дваімі дзецьмі — 5 і 3 год. У выніку аварыі адразу загінулі тры чалавекі з машыны-абгоншчыцы, шэсьць чалавек атрымалі раненьні рознай ступені цяжкасьці. Праз некалькі дзён 22-гадовая пасажырка «Джэты» і сьвятар ад атрыманых цяжкіх чэрапна-мазгавых траўмаў памерлі ў рэанімацыі. Абодва кіроўцы, як і іх пасажыры, былі цьвярозымі.

Адрэзак кальцавой ля Лучнікаў ужо ня раз быў месцам сутыкненьня машын. Некаторыя вяскоўцы прыпамінаюць, што раней на тым месцы стаяў крыж і, калі выраўноўвалі дарогу, яго зьнесьлі.

## Разьвіталіся з жыцьцём удваіх

Вёска Покрашава за сваю шматгадовую гісторыю ня памятае таког здарэньня, каб у адзін дзень скончылі самагубствам 62-гадовы мужчына і ягоная 58-гадовая жонка, калгасная пэнсіянэрка. Вядома толькі, што перад гэтым муж вярнуўся з анкалягічнага цэнтру з дыягназам на рак лёгкіх і без надзеі на папраўку. Жонка пасьля гаварыла суседкам, што ў выпадку сьмерці мужа яна і дня не пражыве безь яго. Памерлых выявіла, на просьбу іх сына-гараджаніна, родная сястра нябожчыцы. Адчыніўшы дзьверы, убачыла два трупы на ложку і на стале бутэльку з-пад віна. Экспэртыза пакуль ня высьветліла, якую атруту прынялі нябогі.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Дзень пры дні — і ўсё жыцьцё

20 траўня ў Горадні адбылася прэзэнтацыя кнігі Апанаса Цыхуна «Пройдзеныя шляхі-пуцявіны (запіскі, успаміны, аўтабіяграфія)».

Веды Апанас спасьцігаў у польскай сямігодцы, Гарадзенскай настаўніцкай сэмінарыі. За паўгодзьдзе патрабавалася заплаціць 80 злотых. Грошы на той час немалыя. Таму давучыцца не ўдалося. Удзельнічаў у другой сусьветнай — бараніў ад нацыстаў Варшаву ў 1939-м. У 1944 г. пачаў пэдагагічную работу. Добра ведаў Міхася Васілька, Фёдара Янкоўскага, Юльяна Пшыркова, Аляксея Карпюка. Лёс зводзіў яго з Быкавым, Брылём, Гілевічам, Голубам, кампазытарамі Шыдлоўскім і Петрашэвічам. Усё гэта — ва ўспамінах. Такі ён, наш Апанас Пятровіч, на 95-м годзе жыцьця. Каб да гэтага ды шчэ пабачыў сьвет ягоны зборнік публіцыстыкі!

## У Горадні будзе фэст

Ледзь не на вушах стаяць розныя службы Горадні, аб пасьпець выканаць неабходныя работы да пачатку 5-га Ўсебеларускага фэстывалю нацыянальных культур (4—6 чэрвеня). Чакаецца прыезд А.Р. і чынавенства высокага ўзроўню.

На падрыхтоўку пайшло амаль 200 мільёнаў рублёў. Грошы выдаткоўвалі гар- і аблвыканкамы, Міністэрства культуры, Міністэрства па справах нацыянальнасьцей, спонсары. У гэтыя дні 10 асноўных пляцовак і 17 нацыянальных падворкаў наведае блізу 100—120 тысяч чалавек. Праграма фэстывалю ўключае ўрачыстае шэсьце, гала-канцэрт калектываў, сьвяты мастацтва, паэзіі, нацыянальнага кіно, фаервэрк.

Бярозаўскі шклозавод «Нёман» вырабляе прызы. Цэнтар гораду будзе аб'яўлены пешаходнай зонай. Пацерпяць уладальнікі ўласнага аўтатранспарту. Як засьведчылі арганізатары прэс-канфэрэнцыі, практыка паказвае, што ў дні сьвята рэзка зьмяншаецца злачыннасьць. Праўда, у час мінулага Ўсебеларускага фэстывалю сьмерць напаткала юнака, які ўзьняў на рукі дзяўчыну.

Збор і вываз сьвяточнага і пасьляфэстывальнага сьмецьця, як заўсёды, ускладаецца на работнікаў жыльлёва-камунальнай гаспадаркі. Сьвяточны настрой гараджан і гасьцей гораду ў прамым сэнсе залежыць ад іх увішнасьці. Але чаго ня вытерпіш, калі жыць зрабілася весялей!

**Антон Лабовіч, Горадня**

## Клюб «Каму за трыццаць» парушыў дырэктыву №1

Крычаўскі райвыканкам спыніў дзейнасьць мясцовага клюбу чыгуначнікаў «Каму за трыццаць». Прычына такіх санкцыяў — парушэньне дырэктывы №1: падчас рэйду міліцыі сябры клюбу былі ўсе да аднаго засьпетыя ў стане алькагольнага ап'яненьня. А клюб жа пачаў працаваць толькі два месяцы таму.

**Ягор Клішэвіч, belngo.info**

## Згадалі Васіля Быкава

У рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных у Полацку да Дня гораду, 22 траўня ў гарадзкой бібліятэцы адбылася гадзіна памяці Васіля Быкава. У імпрэзе ўзялі ўдзел празаік Анатоль Кудравец і паэт Анатоль Зэкаў. А.Кудравец падараваў бібліятэцы нумар часопісу «Новый мир» за 1966 г., у якім была надрукавана аповесьць Быкава «Мёртвым не баліць».

**Васіль Кроква, Полацак**

## Прывітаньне з Каўказу

Жыхары вёскі Магіліцы, што на Івацэвіччыне, вельмі ўзрадаваліся прыезду асоб каўказкай нацыянальнасьці і іхняму намеру купіць бульбу. За адзін кілаграм госьці давалі 200 рублёў, а ня 100, як плаціць нарыхтоўчая кантора. На такую прынаду клюнуў сельскі люд. На роварах і фурманках павезьлі сяляне да чужога «КамАЗу» свой стратэгічны прадукт. Замест грошай брунэты раздавалі вяскоўцам расьпіскі, горача запэўніваючы, што праз некалькі дзён прывязуць грошы. Калі грузавік быў запоўнены пад завязку, «сыны гор» разьвіталіна памахалі ручкамі, як Бэндэр мільянэру Карэйку.

Мінуў месяц, на зыходзе другі, а доўгачаканых гарачых паўднёвых хлопцаў ні ў вёсцы, ні на даляглядзе не заўважана.

Горкі асадак застаўся і ў гаспадара дома, у якім начавалі купцы. Яму давялося заплаціць сувязістам 90 тыс. рублёў за тэлефонныя размовы, якія вялі са сваёй радзімай госьці.

**Алесь Лаўранюк, Івацэвічы**

# Маё пакаленьне працуе

## Мікола Шакель: Мне самому двойчы ставілі дыягназ «нэрвовае зьнясіленьне»

**Выйшаў 100-ы з часу аднаўленьня нумар часопісу «Студэнцкая думка». Канцэпцыя «СтуДумкі» — «шэры глянец». «CD» — ці яна табе ідзе, ці скандалізуе цябе або выклікае пагарду — прымушае прызнаць: гэта новае, такога раней не бывала. Нешта нябачанае сярод белмоўных выданьняў. Нічога супольнага з традыцыйнай «роднай старонкай» etc. «CD» адрозьніваецца таксама ад глянцу часопісаў тыпу «Мэнз Хелс». «CD» хаваецца пад абалонкай глямуру і моцна косіць пад глямур. Але гэта «разумны глямур», калі форма ад аднаго, а зьмест і IQ — з прэтэнзіяй на зусім іншае. Гэта мімікрыя, форма выжываньня ці стыль пакаленьня? З сурэдактарам выданьня Міколам Шакелем гутарыць Сьвятлана Курс.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Трохі біяграфічных зьвестак: дзе, як і калі нарадзіліся.**

**Мікола Шакель:** Як нарадзіўся — ня памятаю: адразу ж страціў прытомнасьць. Гэта адбылося ў 1978 г. у Браславе. Потым скончыў школу з залатым мэдалём, у піянерах пабыў, камсамолу не засьпеў. З 9 клясы перамагаў на розных алімпіядах па беларускай мове, таму бралі без іспытаў на любую гуманітарную спэцыяльнасьць. Я абраў рамана-германскае аддзяленьне філфаку БДУ. Аддзяленьні там былі малыя, на францускім вучылася 12 чалавек: «11 дзевак, адзін я».

**«НН»: І як вы бавілі час вучобы?**

**М.Ш.:** Бавілі — гэта ня тое слова. На беларускім, расейскім і расейска-беларускім аддзяленьнях філфаку сапраўды прынята клясычная савецкая мадэль адукацыі: чалавек прыяжджае вучыцца, засяляецца ў інтэрнат і весела жыве, а за месяц да сэсіі пачынаюцца сэмінары і тады ўжо ідзе сапраўдная вучоба! У нас жа ўсё было наладжана, як у Лінгвістычным унівэрсытэце, толькі са значным элемэнтам літаратуры і культуралёгіі. З тых, хто скончыў аддзяленьне, некаторыя прыляпіліся да амбасадаў, пачалі перакладаць, а рэшта працуе як Бог на душу паклаў. Яркі прыклад: паралельна са мной на ангельскім аддзяленьні вучыўся Віця Жыбуль.

**«НН»: Пераход ад студэнцкага жыцьця да студэнцкае думкі быў натуральны й плаўны?**

**М.Ш.:** Абсалютна рэзкі. Я працаваў перакладчыкам у розных выданьнях. Потым паступіў у асьпірантуру і зразумеў, што есьці таксама трэба. Да таго ж я граў у гурце «Цмокі», патрэбны быў гітарны працэсар, а ён дарагі. Давялося ісьці зарабляць. Андрэй Скурко падкінуў працу ў «CD».

**«НН»: Хто каго перарабіў на свой капыл — Вы працу альбо яна Вас?**

**М.Ш.:** Праца мяне. Раней я быў больш афіцыёзным чалавекам, чалавекам ад навукі. Паступова я пачаў выглядаць інакш і заўважыў гэта, калі на мяне часам скоса пазіралі некаторыя выкладчыкі на філфаку БДУ. І дрэс-код, і выгляд у мяне такі, што студэнты лічаць мяне за свайго.

**«НН»: «Студэнцкая думка» зьмяняе Вас, але й Вы імкняцеся незаўважна зьмяняць студэнтаў…**

**М.Ш.:** Любое выданьне павінна незаўважна кагосьці выхоўваць. Тыя, хто робіць гэта заўважна, доўга не жывуць. Іх называюць «тэндэнцыйнай прэсай».

**«НН»: Ёсьць розныя падыходы. Адны выхоўваюць, а другія робяць тое, што ім самім цікава.**

**М.Ш.:** Натуральна, мы робім тое, што даспадобы й нам. Але калі б мы арыентаваліся толькі на сябе, гэта было б, як сказаў Флябэр, сядзеньнем у вежы са слановай косткі. Раней «CD» было выданьнем для тусоўкі, зробленай самой гэтай тусоўкай. Чытачы добра ведалі тых, хто піша, і наадварот. Калі прыйшоў Сахараў, мы пачалі рабіць папсовы часопіс.

**«НН»: Які мала нагадваў той, што выходзіў 80 год таму. Той жа быў змагарніцкі, абуджэнскі й беларускадухоўны.**

**М.Ш.:** Такі ён і быў. Але ў той жа час яны рабілі спробы папсовага праекту. Сама ідэя размаўляць і пісаць па-беларуску была больш папсовая, чым цяпер. Гэта быў мэйнстрым, асабліва ў Вільні. Цяпер мы спрабуем гэта зрабіць мэйнстрымам. Сёе-тое ўдаецца.

**«НН»: Вы абвесьцілі пра выданьне сотага нумару? За які гэта пэрыяд?**

**М.Ш.:** Згодна са скразной нумарацыяй з 1998 г. З таго моманту, калі за часопіс узялася Іра Віданава — наш «галоўрэд» і нязьменны бос.

**«НН»: У што вырасьце «СтуДумка» на працягу наступных ста нумароў? Як бы вы жадалі?**

**М.Ш.:** Гледзячы на тое, як усё тут павернецца. Я б жадаў, каб мэдыя-рынак быў такі, як цяпер у Польшчы. Там цяпер бум СМІ. Шмат моладзевых часопісаў, гэта

# Мы — актывісты



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Ірына Віданава**, галоўрэд «CD»: «Беларускамоўнасьць — гэта адзін з прынцыпаў. Зьменім мову — і гэта ўжо ня будзе «Студэнцкая думка». Мова — гэта інструмэнт, якім мы даносім наша сьветаўяўленьне. Мы задавалі нашым чытачам пытаньне, ці зразумелі б яны, што гэта беларускі часопіс, калі б ён выходзіў на расейскай мове. І большасьць рэспандэнтаў адзначыла, што часопіс выразна беларускі ня толькі і ня столькі моваю, колькі сваім зьместам. Выданьне зроблена ў Беларусі! І будзе беларускамоўным — гэта як своеасаблівы дадатковы знак якасьці. І для нашых рэклямадаўцаў беларускамоўны фармат выданьня не стварае нейкай перашкоды ані для нас, ані для іх. Але вялізная частка буйных фірмаў маюць распрацаваную рэклямную стратэгію, пабудаваную на расейскай мове, альбо залежаць ад сваіх замежных гаспадароў. Для іх мы разьмяшчаем рэклямныя матэрыялы на мове, якую вызначыў замоўца. Пакуль мы ня можам дазволіць сабе раскошу адмовіцца ад прыстыжнай і выгоднай замовы на падставе аднаго толькі моўнага фактару. Але тыя фірмы, якія не прывязаны да нейкіх буйных структураў па-за межамі Беларусі, спрыяльна ставяцца да перакладу іх матэрыялаў на беларускую мову. Гэта датычыцца нашых сталых рэклямадаўцаў».

**Сяргей Сахараў**, сурэдактар «CD»: «Прынцыповая пазыцыя не азначае «стаяць і біцца мазгаўнёй аб сьцену і казаць: «Я беларускамоўны». Спэктар паслугаў, якія мы прапануем сваім чытачам, робіць пытаньне мовы другарадным для чытача. Беларускамоўнасьць тут успрымаецца як зададзенае наяўнае становішча: візуальнае ўвасабленьне часопісу і тэксты самі па сабе маюць на ўвазе беларускамоўнасьць. Актывіст можа выяўляць сваю актыўнасьць ва ўсім, у тым ліку і празь беларускую мову клясычнага правапісу».

**Юры Чавусаў**

# з раніцы да ночы

проста забіты сэктар. Кожны часопіс мае нішу. «Dlaczego» — часапіс для старшакурсьнікаў, «Cogito» — для старшаклясьнікаў і малодшакурсьнікаў, «Fluid» — для тых, хто цікавіцца дызайнам. Куча рокерскіх, клюбных і іншых часопісаў. Нам жа даводзіцца пісаць пра ўсё: і што рабіць, калі ўнівэрсытэт незаконна патрабуе грошы за пераздачу, і што модна ў гэтым сэзоне. Але справа ў тым, што іншага прадукту для моладзі цяпер няма. Мне б хацелася, каб гэта быў часопіс, пад глямурным абліччам якога хавалася б глыбіня, пранікненьне ў праблему. Каб можна было глядзець прыгожую карцінку й чытаць сцёбныя тэксты, прытым зьмяняючы нешта ў мазгах. Аналягі — ангельскія часопісы «Wallpaper», недзе блізка — «Face» і «Pop».

**«НН»: Усё ж Вы выступаеце як апекуны: імкнецеся падсунуць дзецям вітаміны пад выглядам цукеркі.**

**М.Ш.:** Яны падтрымліваюць гэта — спалучэньне глыбокага са сьмешным і сур'ёзнага са сцёбным. Сьвядома ці не? Сумна жыць, калі ўсё сьвядома. Будзем рабіць яшчэ больш прыгожа, часопіс паспрабуе стаць наскрозь каляровым. Мы будзем тоўстымі, павялічым наклад. Калі рынак СМІ зьменіцца, трэба будзе добра круціць мазгамі, каб абраць нішу, бо тут усё пачне расьці як на дражджах.

**«НН»: Вось прыйдуць «нашы» да ўлады…**

**М.Ш.:** Усё ў парадку. Нашы ўжо тут. Але яны сядзяць і працуюць напаўсілы. Калі запрацуюць напоўніцу — усе ўбачаць, што яны заўжды былі тут. Не наляцяць ніякія іншапляннэтнікі, ня будзе моцных фінансавых уліваньняў. Хіба што другі раз прыйдзе Хрыстос, але тады позна будзе штосьці рабіць.

**«НН»: Значыць, у Вас няма вобразу Беларусі лепшай, чым яна ёсьць цяпер?**

**М.Ш.:** Чаму? Гэта нармальная, цывілізаваная краіна, але не такая старая, не з такой зношанай мэханікай на ўсіх узроўнях, як, скажам, Францыя. Тут вялікія шанцы ў найбліжэйшы час зрабіць другую Польшчу альбо яшчэ аднаго балтыйскага тыгра. Галоўнае, каб «нашы» не сядзелі, а запрацавалі на поўную моц. Калі тут яшчэ ёсьць нехта, хто працуе напаўсілы.

**«НН»: Парадоксамі прамаўляеце.**

**М.Ш.:** Ды не, людзі майго пакаленьня працуюць з раніцы да ночы на трох працах. Мне самому два разы ставілі дыягназ «нэрвовае зьнясіленьне». Доктар неяк сказаў мне: «Як ня кінеш аднае працы, а найлепей дзьвюх, дык яны цябе дастануць». Я ня кінуў. Калі мы рабілі нумар «Крызыс 25-ці», мы прадумалі глябальныя зьявы нашага пакаленьня. Найперш гэта непрафэсіяналізм. Таму так многа працуем. Наша сыстэма адукацыі не разьлічана на патрэбы сучаснага рынку. Рынак працы і адукацыя існуюць неяк паралельна. Адукацыя даволі моцная, але малаэфэктыўная. Ізноў парадокс, але гэта насамрэч так. Выходзіць так, што нас навучылі, мы па-сапраўднаму разумныя, але ня ўмеем нічога практычнага зрабіць. Адпаведна маладыя й нахабныя, што павылазілі на пазыцыі лідэраў у розных галінах, — непрафэсіяналы. Няма прафэсійных прамоўтэраў, журналістаў. Прафэсійнай журналістыкі няма, хаця журналістыка моцная. Журфак усіх проста псуе, а тыя выдатныя людзі, што там ёсьць, і без журфаку былі б выдатныя. Непрафэсійны чалавек хапаецца за ўсё. І цягне воз.

**«НН»: Ці маеце Вы вобраз Вашае аўдыторыі?**

**М.Ш.:** Людзі да 30 год, якія атрымліваюць або атрымалі вышэйшую адукацыю, не замарочаныя на навуцы, не «батанікі», але людзі, якія імкнуцца больш ведаць. Людзі эўрапейскага тыпу, якія нават на вуліцы нечым такім вылучаюцца з

> Лёгкасьць і папсовасьць паўсюдна. Няма нічога для мазгоў. Чалавек павінен весяліцца, адпачываць, тады ўсё будзе добра? Магчыма.

масы хлопцаў у скураных куртках і з кароткімі стрыжкамі ды дзяўчат у аляпавата сцёртых турэцкіх джынсах і з вострымі насамі туфляў а-ля Маленькі Мук. Але гэта й не прапаленыя тусары, што стаяць ля «Макдону». Нашы больш інтэлігентныя. Яны прагнуць посьпеху ў гэтым жыцьці і нешта для гэтага робяць. Гэта збольшага расейскамоўныя людзі, але ў анкетах на пытаньне «Якой мовай Вы хацелі б карыстацца ў штодзённым жыцьці?» яны адказваюць — «беларускай». Ну, пакуль што ня могуць.

**«НН»: Ці азначае гэта, што ў Менску (і іншых гарадох) паўстаў той самы «гарадзкі субстрат»?**

**М.Ш.:** Нейкае падабенства ёсьць, але не такое моцнае, як у Варшаве. Менск — вясковы, асабліва ў мікраранах. Я магу меркаваць толькі пра кола часопісу. У гэтым выпадку — так, гарадзкая супольнасьць склалася. Мне цяжка меркаваць пра гэта яшчэ й таму, што я гарадзкі чалавек, пераклапаны зь местачковага. Некаторыя замарочкі нашага сурэдактара Сяргея Сахарава, які гараджанін невядома ў якім пакаленьні, мне незразумелыя, а часам і не падабаюцца.

**«НН»: І ў чым Ваш местачковы мэнталітэт? Ваша «мястэчка» падобнае да «Відзаў» Кастуся Качана альбо на раман Баршчэўскага?**

**М.Ш.:** Тыповае ўяўленьне гараджаніна-турыста — рай №2. Першы рай — Нарач, другі — Браслаў, трэці — Прыпяць (трэці падпсаваны Чарнобылем).

**«НН»: Першы рай, і нават вырай — усё ж Вільня!**

**М.Ш.:** Я гавару пра Беларусь у сучасных межах. Паколькі я доўга жыў у Браславе, я стаўлюся да гэтых мясьцінаў досыць празаічна. Улетку там фізычна вельмі прыемна. Можна ўзяць човен, плаваць, загараць і нават вылавіць двух карасёў. А ўзімку там сумна, ліхтары ня сьвецяць, усё замецена сьнегам, бо вуліцы не расчышчаюцца. Мае аднакласьнікі людзі талковыя, але апошнія гады ўсё цяжэй знайсьці, пра што зь імі размаўляць. Гэта, натуральна, вельмі сумна.

**«НН»: А хто ў Вас там застаўся зь сям'і і ці ганарацца яны Вашай кар'ерай?**

**М.Ш.:** Маці й бабуля. Маці гарнарыцца, расказвае ўсім, што яе сын у 25 год абараніў дысэртацыю, але на ўзроўні падсьвядомасьці яна, думаю, ня надта задаволеная. Паўгадзіны таму я зь ёй размаўляў і ня мог растлумачыць, чаму, працуючы на трох працах, не магу вырвацца на выходныя. Шмат часу забірае трэцяя праца — пераклады. Я вярнуўся да таго, з чаго пачынаў на першым курсе, — да літаратурных перакладаў. Я трапіў у праграму «Максім Багдановіч» пры францускай амбасадзе, і з друку нядаўна выйшла першая частка анталёгіі «Сучасная француская драматургія», там я пераклаў п'есу. А цяпер я рыхтую на замову раман сучаснага аўтара Патрыка Кавэна.

**«НН»: А калі б у Вас былі грошы перакладаць не на замову, каго б Вы ўзялі?**

**М.Ш.:** Ды была б мая воля, я б увогуле нікога не перакладаў. Зрэшты, я пераклаў бы сёе-тое з Гюісманса, па якім я пісаў дысэртацыю. Але гэта некамэрцыйны аўтар, які не дае мазгам расслабіцца. Калі трэба расслабіцца, лепш ісьці ў кіно, галівудзкае кіно. На жаль, гэтая лёгкасьць і папсовасьць у нас паўсюдна, і пры стварэньні часопісу «Студэнцкая думка» ў прыватнасьці. Ва ўсім, куды ні кінь. І ў газэтах вялізныя фоткі.

**«НН»: Адсутнасьць канцэпцыі ва ўсім. Гэта такая жудасная посттаталітарная зьява!**

**М.Ш.:** Гэта прыкмета таго, што мы не ізаляваныя, таму што гэта паўсюль. Прывозяць з-за мяжы шыкоўна выдадзеныя бэстсэлеры — няма нічога для мазгоў. Для душы — так, для весялосьці — шмат чаго, але для розуму мала. А можа, гэта й някепска: чалавек павінен весяліцца, адпачываць, тады ўсё будзе добра.

**«НН»: Акуна матата. А як жа магістральныя імкненьні, пляніраваньне жыцьця, глябальныя мэты?**

**М.Ш.:** Нічога супраць ня маю. Яны і ёсьць у кожнага чалавека. Так, я чалавек-арганайзэр, у якога расьпісана ўсё да канца жыцьця. Я стараюся быць больш бесклапотным. Але вельмі нэрвуюся ў такія дні, як сёньня, калі паляцела сетка і я нічога з раніцы толкам не зрабіў. Дзякуй богу, што ёсьць калегі, якім усё да ліхтара. Гледзячы на іх, пачынаеш разумець, што нэрвавацца ня трэба і тое, што немагчыма, — немагчыма. А так я ведаю, што буду рабіць, аж да пэнсіі.

**«НН»: Ва ўсіх сфэрах жыцьця дзейнасьці?**

**М.Ш.:** Што датычыць прыватнага, некаторыя сумневы ёсьць.

**«НН»: Калі б Вам далі столькі грошай, колькі Вам трэба дасхочу, што б Вы рабілі? Ляжалі б са шклянкай віна і філязофствавалі?**

**М.Ш.:** Паглядзіце на мяне. Хіба мне хто дасьць столькі грошай? А калі сур'ёзна, я б уклаў гэтыя грошы ў стварэньне мэдыяканцэрну.

## «CD»-сакавік




«Олдскул флэйва» — назва redlist'а ў сакавіцкім нумары «Студэнцкай думкі». Данчык, чары Мулявіна, Міхалок, «Мроя» — легенды олдскулу БССР—РБ. Таксама ў нумары школа супэргерояў «Zivil courage: бяз гвалту». А таксама містэр «ь» — «Bronik as we love him».

## «CD»-красавік




«CD» — 80. Часопіс, пішуць у redlist'е, на 29 год старэйшы за «Плэйбой». Таксама ў нумары: ці варта плаціць унівэру за адпрацоўкі, прафэсія — рэдактар і «адкуль бяруцца бацькі». Бонус — магчымасьць убачыць боса Ірыну Віданаву.

# «Мова павінна быць бруднай»


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

## Моўныя фічы «CD»

«Мова мусіць быць арганічнай. Таму мова «CD» набліжана да жывой, вулічнай», — кажа Сяргей Сахараў (на фота), рэдактар «Студэнцкай думкі». «CD» штонумар уводзіць у мову дзясяткі раней не ўжываных словаў. Часопіс, напрыклад, актыўна запазычвае для беларускай мовы з ангельскай.

«Адно зь першых слоў, якія мы прыдумалі, — кажа Сахараў, — «клабэліці». З ангельскага «клюбная эліта». Стварылі слова адмыслова для верасьнёўскага нумару за 2002 год. Ён быў прысьвечаны клюбнай культуры. Тады нам здавалася, што клабэліці — крутыя, але калі б пісалі пра тое ж сёньня… Стаўленьне было б дакладна іншым. Сюды ж дадаў бы слова «клабэрша» — дзяўчынка, якая сэнсам свайго жыцьця бачыць бадзяньне па клюбах».

Нэалягізмы ў «Студэнцкай думцы» нараджаюцца калектыўна. Нехта прыносіць ідэю таго, што трэба неяк арыгінальна назваць, а пасьля калектыўна шукаецца-прыдумваецца слова. Чыста сахараўскае слова — «цішотка» ( ад ангельскага «t-short»). Азначае байку ці саколку з кароткімі рукавамі.

Сяргей разам зь Міколам Шакелем прыдумаў тэрмін «майкрасэрфэр» (ад ангельскіх слоў «Microsoft» + «serf»). Паводле думкаўскага азначэньня — «вольнанаёмнік ад хайтэку, дрэйфуе з канторы ў кантору ў пошуках цёплага месца». «Лузэр» (анг. «lose» — прайграваць) — той, хто не зрабіў кар'еры, канфарміст, лічыць сябе кар'ерыстам.

У лексыцы «Студэнцкай думкі» ўжо зьявіліся групы антонімаў. Клон — урод. Член (БРСМ)… «Звычайна мы пішам «сябра» партыі ці якога-небудзь аб'яднаньня, але ж часам проста варта напісаць «член», — кажа Сахараў. «Підар» — значэньне адышло ад першапачатковага. Цяпер гэта азначае «поўны лузэр, для якога няма ніякіх маральных каштоўнасьцяў; апошняя стадыя адмарозка». Супрацьпаставіць підару можна «актывіста». Гэтаму чалавеку, актыўнаму па жыцьці, рэальна больш за ўсіх патрэбна. «Актывіст» — той, хто крытычна глядзіць на сьвет і хоча быць паўсюль першым. Яшчэ «падшыванец» — такі малады бандзюган, які шукае, чым бы заняцца.

«CD» змагаецца з тымі ж пурыстамі, якія кажуць, што белмова павінна быць чыстай, — кажа Сахараў. — Мы набліжаем мову да вулічнай, сьвядома парушаючы літаратурныя нормы».

Нярэдка словы бяруцца зь менскага слэнгу. Адтуль узята «музло». «Ака» — прыстаўка, накшталт «фон» («фон-барон»). Далучае другое імя чалавека, нік. «Брута» — вымярэньне брутальнасьці чалавека. «Трэш», «тырыцьць», «тупарылы» — усе гэтыя словы перайшлі на старонкі «CD». Моднай, «як і ты».

**Сяргей Трафілаў**

# Як файна жыць

## Аляксандар Памідораў: Мая вуліца — мой офіс

**28 траўня ў клюбе «Рэактар» адбудзецца сольны канцэрт гурту «Pomidor/Off» — праекту музыканта, ды-джэя і журналіста Аляксандра Памідорава, у якім бяруць удзел басіст «Крамбамбулі» Сяргей Канановіч, бубнач Аляксандар Быкаў (таксама «Крамбамбуля») і гітарыст Слава Корань («Уліс»).**
**З Памідоравым на сцэну, як чакаецца, выйдуць таксама людзі, што дапамагалі ў запісе дэбютнага дыску ягонай групы: Алег Хаменка з «Палацу» і Юлія Сеўрук з «Пастскрыптуму». Праграма «Сьвята пакрадзенае», якая выйшла два гады таму, ніколі ня гралася цалкам, таму гэты канцэрт такі доўгачаканы. Памідораў таксама абяцае зайграць некалькі песень з супольных праектаў і прэзэнтаваць новыя. У межах канцэрту пройдзе прэзэнтацыя зборніку «FuckShowBusiness!»: свае кавэры на сусьветна вядомыя шлягеры зайграюць гурты «Сініца», «Partyzone», «IQ-48». «Канцэрт мне вельмі патрэбны, а таму адбудзецца ў любым выпадку», — кажа музыкант, намякаючы, пэўна, на тое, што частку аўдыторыі ён можа страціць: у гэты ж дзень і ў гэты самы час у Тэатры юнага гледача акустычную праграму грае «Крама».**
**З Памідорам гутарыць карэспандэнт «НН».**


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Часам гавораць: «Памідораў адзіны, хто працуе ў сфэры беларускага рэпу».**

**Аляксандар Памідораў:** Быў яшчэ гурт «Сонца Мао» — файныя рэчы стваралі. Алесь Таболіч... Але што тычыцца гітовасці і падачы — на жаль, акрамя «Цуду на калядах» і «Дня без гарэлкі», я пакуль нічога ня чуў. Была спроба зрабіць нешта — гэта «Нестандартны варыянт» з Вольскім, але мяне вельмі расчаравалі гэтыя хлопцы на трыб'юце «NRM». Я чакаю, што хто-небудзь дасьць чаду і запхне мяне куды-небудзь у тым, што тычыцца рэпу і беларускай мовы ў гэтым стылі.

**«НН»: Музыка для цябе — сродак адпачынку ці праца?**

**А.П.:** Музыка як праца — гэта калі я на радыё ці на дыскатэках. Вось калі выходзіш на сцэну і граеш сваё, тады музыка — праца і асалода, бо, па-першае, да выступленьня трэба ставіцца сур'ёзна, а па-другое, гэта нейкі энэргетычны выбух, у звычайным жыцьці немагчымы. Хутчэй за ўсё гэта і ня першае і не другое, а проста сэкс. Нават гэта лепей, чым сэкс.

**«НН»: А калі б ня музыка, чым бы займаўся?**

**А.П.:** Разводзіў бы памідоры. Завёў бы сабе парнічок. Ці, можа, у якім-небудзь бары працаваў бы бармэнам.

**«НН»: Памідораў — гэта твой псэўданім. Ён вынікае з такой прыхільнасьці да памідораў?**

**А.П.:** Не. Была невялічкая гісторыя. Аднойчы мы зь сябрам пад песьню Юры Шаўчука пра тэрарыста Івана Памідорава разграмілі пакой нашай знаёмай. На наступны дзень мяне іначай як тэрарыстам Памідоравым ужо ніхто не называў. Ну, гэта яшчэ ў тыя, студэнцкія гады, калі я вучыўся ва Ўнівэрсытэце культуры. Але памідоры я вельмі люблю. *(Сьмяецца.)* Ня кіслыя, а нармальныя, сьвежыя, сьпелыя. У мяне растуць такія салодкія, добранькія.

**«НН»: Шлях у музыку таксама пачаўся ў БУКу?**

**А.П.:** У нас з маім малодшым быў такі гурцік, называўся ён «П'яныя госьці» (усё гэта існавала з 1988 году і пачалося ў Ламаносаве, што пад Ленінградам). Годзе недзе ў 90-м зьявілася адна песьня на беларускай мове — такая сацыялізаваная лірыка пра перагібы беларусізацыі. Потым зьявілася яшчэ адна песьня падчас стагнацыі ў 1993 г., калі пачалі завальваць Вярхоўны Савет. Усё — балота, багна. БНФ падзяляўся, як амёба, замест рэальных справаў пачалося невядома што. У першай песьні было цікава паспрабаваць зрабіць штосьці на мове; другая зьявілася больш проста, як і мае быць. А потым былі экспэрымэнты з мовай і рэпам, зь якіх вылілася на спрэчку напісаная «Цуд на калядах»… *(Інтрыгоўна.)* Так-так, мы паспрачаліся зь Веранікай Кругловай, што я напішу рэп пабеларуску. І за паўтары гадзіны была зроблена песьня. Яна ўдалася і, з крыху зьмененым тэкстам, трапіла ў «Сьвяты вечар».

**«НН»: Вяртаючыся да мовы: ці ня лічыш ты, што зьмена дзяржаўнае палітыкі ў 94-м была выкліканая той беларусізацыяй, якую ты крытыкаваў у сваёй першай белмоўнай песьні?**

**А.П.:** Не, пры паступовым і нармальным разьвіцьці хваля гвалту схлынула б. Людзі ўжо пачалі цікавіцца мовай: зьяўляліся нейкія моўныя артэфакты, рэчы, пераклады цікавыя. У 94-м годзе, калі пачаўся такі сур'ёзны адкат на дзяржаўным узроўні, ізноў было абвешчана дзьвюхмоўе… Ну, я лічу гэта калі не крыміналам… Мы зрабіліся нацыяй без гісторыі, без мовы і без культуры. На жаль, гэта працягваецца і цяпер. Спадзявацца на інтэлектуальную моц народу не даводзіцца, бо аўтары добрыя і выдатныя забараняюцца, а то й проста сыходзяць, напрыклад такія, як Быкаў.

**«НН»: Лявон Вольскі гаварыў: калі б не палітычная сытуацыя, наўрад ці быў бы такі гурт – «NRM». А што скажаш пра сябе?**

> Сябры? Галоўнае, каб зь імі вельмі добра ў дарозе. Для мяне гэта самы галоўны крытэр: ня тое, каб у разьведку пайшоў, а вось як у дарозе.

**А.П.:** Увогуле, дзяржава — гэта гвалт над асобай, рэжым і падпарадкаваньне. Проста ёсьць больш жорсткія рэжымы і больш мяккія. Мне аднолькава не падабаецца тое, што робіцца ў нас, у Расеі ды ў той жа Нямеччыне.

**«НН»: Пра Нямеччыну падрабязьней, калі ласка.**

**А.П.:** Пачуеш што тут, што ў Бэрліне, што ў Ляйпцыгу: рахункі, лекі, дзеці, шэф на працы, машына і г.д. Але там у людзей даўно сталыя маршруты вызначаны па жыцьці — праца, дом, кнайпа, парк, дом. І ўсё, што па-за гэтымі межамі, мае дозы ўжываньня і прадказальную форму. А мы ўсё ж жывём непрадказальна.

**«НН»: Ці шмат сяброў мае здаравяк Памідораў?**

**А.П.:** Сябар ня можа быць увесь час побач. І разыходзішся, і сыходзішся. Ёсьць у мяне сябры, зь якімі можна нават ні пра што не размаўляць, але зь імі вельмі добра ў дарозе. Для мяне гэта самы галоўны крытэр: ня тое, каб у разьведку пайшоў, а вось як у дарозе…

**«НН»: Канцэрт адбудзецца амаль роўна праз пяць гадоў пасьля трагедыі на Нямізе. Сьцены падземнага пераходу стаяць чысьцюткія: зь іх пазмывалі надпісы й фатаздымкі, што білі мацней за прыгладжана-бронзавы мэмарыял з прэзыдэнцкімі словамі. Неафіцыйным помнікам ахвярам стала тваё «Крывавае сьвята»...**

**А.П.:** Мне цяжка пра гэтую песьню гаварыць. Але яно ўжо ня так баліць. Увасобіўшыся ў нейкую песьню, ноты, гукі — гэта ўсё ўспрымаецца ня так, як успрымалася першыя дні ці тыдні. Напісалася яна хутка, са слоў людзей, якія там былі, з інфармацыйных паведамленьняў. Бо я раніцою наступным днём сядзеў у радыёэтэры. Самае страшнае, калі дзяўчынка адна рас-

# непрадказальна

павядала, што на Нямізе было, як яна ледзь не загінула… Мае знаёмыя там былі, але, дзякуй Богу, не патрапілі ў гэты пераход. Яны бачылі ўсё, прыпынялі машыны, дапамагалі кагосьці выцягваць. Жудасна, калі зялёная трава — і па ўсёй гэтай зялёнай траве ляжаць белыя прасьціны. Накрытыя людзі, «хуткая дапамога»… Гэта ня песьня ўражвае. Гэта мусіць уражваць тое, што адбылося. І тая справа, спушчаная на тармазах. І тое, што заткнулі рот бацькам. Гэта дурасьць нейкая, калі некаторыя бацькі, атрымаўшы грошы, замоўклі. А астатнія, якія працягвалі змагацца з сыстэмай, — іх паставілі па-за законам. Вось што мусіць уразіць.

**«НН»: Ты працуеш на СТВ, якое ачольвае Аляксандар Зімоўскі, у праграме «Тэхналёгія». Алег Клімаў з «Музыкальной газеты» выказаўся вось як пра гэта: «Памідораў, музыкант-апартуніст, спакойна разьмясьціўся ў тэлеэтэры каналу, якім кіруе яго ідэалягічны праціўнік...»**

**А.П.:** Асабіста Клімаву я ўдзячны за такое маё вызначэньне — музыка-апартуніст. Мне спадабалася! А наконт ідэалягічнага апанэнта… Шапачна зь ім я знаёмы, можа, з году 1992-га. Ніякіх стасункаў асабістых, тым больш палітычных, я зь ім ня меў і не зьбіраюся мець.

**«НН»: Дык гэта праца проста дзеля грошай?**

**А.П.:** Безумоўна. Гэта нават не піяр. Была б мая воля, я вёў бы праграму гэтую ў нейкай масцы.

**«НН»: Ты адчуваеш сябе тут незалежным?**

**А.П.:** Абсалютна, з усімі мінусамі, плюсамі. Не зьбіраюся я тут ныць і стагнаць, што «вось, дзяржава замінае!» Мы жывём проста ў шыкоўнай сытуацыі, бо ў савецкія часы нам нічога не дазвалялі, гаварылі: «Не сьпявацы!» Але мы ўсё роўна сьпявалі. А цяпер тым больш нішто нас не адарве ад родных ніў. Калі ты хочаш нешта зрабіць, ты зробіш заўсёды. І тут не перашкодзіць ні дзяржава, ні злы дзядзька… Ці злая цётка. Мы жывём у дзіўнай краіне, дзе ўлада жыве сабе, людзі сабе — і час ад часу яны перакрыжоўваюцца. Вось цяпер ёсьць шанец аб'ядначца ўладзе з народам, калі Расея пачала ціснуць з газам. Што будзе — ня ведаю.

**«НН»: Нічога сабе — «народ сабе»! А як жа актыўная моладзевая палітыка зь піянерамі й бэрэсэмамі?**

**А.П.:** Мне шкада, што моладзь, якая падрастае цяпер, выхоўваецца ў традыцыях Савецкага Саюзу. Ёй пашчасьціла ніколі ў жыцьці не ўбачыць той краіны, але яны начэпліваюць на сябе майкі з надпісам «СССР», з гербам СССР, з выявай і назвай няіснай краіны. Гэта ўсё кладзецца на падкорачку. Што да аб'яднаньняў накшталт БРСМ… Дык ці ёсьць гэта арганізацыя? Сьмешна. Вядома, з пункту гледжаньня дзяржавы такая арганізацыя павінна існаваць, але Беларусь — вельмі цікавая рэч. Тут на афіцыйным узроўні сьцёрта гісторыя краіны, тым самым зьнішчана ідэалёгія. Мне крыўдна, што тыя ж палякі, літоўцы лічаць сваімі Касьцюшку, Каліноўскага, Міцкевіча, а ў нашай гісторыі ім амаль ніякага месца не адведзена. І на якім падмурку выхоўваць моладзь? На гэтых страшэнных відэароліках БРСМ? Ну, гэта ж сьмешна.

Няма ў нас годнасьці, няма ў нас ідэі. Калі асноўная ідэя нацыі — гэта яднаньне зь іншай дзяржавай, гэта не ідэя і ня нацыя. Гэта не краіна. На маю думку, можа, і мела б сэнс паставіць сьцяну, адсячы некаторыя каналы расейскія, нешта з прэсы расейскай, перапыніць уплыў гэты прапагандысцка-расейскі.

**«НН»: А твая выдатная беларуская мова — зь сям'і, ад бацькоў?**

**А.П.:** У маёй сям'і не было пытаньняў з мовай. Мы нават так ладзілі: адзін дзень па-беларуску размаўляем, другі — па-ангельску, трэці — па-расейску. У мяне настаўніца ў школе была супэр — Варвара Кароль, якая чытала нам у 5—6-й клясе вершы Купалы. Такія жорсткія, наўпрост! *(Вельмі эмацыйна.)* Ня тое каб яны былі забароненыя, не. Але існавалі «пажаданьні» зьверху: «Лепш ня нада».

> Цяпер ёсьць шанец аб'ядначца ўладзе з народам, калі Расея пачала ціснуць з газам.

Урокі былі цікавыя, гэта зацягвала. Яшчэ існаваў пазаклясны гурток «Спадчына», дзе мы вывучалі нешта з гісторыі, хадзілі на раскопкі. І гэта прываблівала. Калі сапраўды цікава, вось ты і ходзіш. У 1986 г. пачаліся буйныя раскопкі пад кіраўніцтвам Зянона Пазьняка на Нямізе, у Верхнім Горадзе.

**«НН»: Што скажаш як радыёзнаўца адносна 50% беларускай музыкі на радыё?**

**А.П.:** Гэта нядзейсна. 50% набіраюцца за кошт ночы. Музыка гучыць у нярэйтынгавы час. Радыёстанцыі дагэтуль хлусяць, што беларуская музыка няякасная. Але нашыя музыкі здаўна вядомы за мяжой. Толькі замест таго каб балбатаць, давайце рэальна рабіць справу. У нас у заняпадзе знаходзяцца і студыя ў Мазыры, і студыя на БТ. Дый умовы нашым музыкам не дазваляюць запісвацца за 30—40 даляраў за гадзіну.

**«НН»: Які ён — беларускі слухач?**

**А.П.:** У нас людзі прагнуць адкрыцьця. І гэта яшчэ адна фаза, якую мы страцілі. Вось такая сытуацыя: заўсёды на канцэртах прысутнічала міліцыя, і мы абавязаны даводзіць да райаддзелу МУС інфармацыю пра канцэрт, які мусіць адбыцца. Так, на адным з канцэртаў «NRM» я заходжу ў залю і бачу, як міліцыянты круцяць маладога хлопца. За што? За тое, што той устаў ды танчыў. Я кажу: «Што ты робіш? Ён жа нічога благога не зрабіў!» А там такі капітан вусаты, які на службе працуе і сам усё разумее, але трэба выконваць загад. Я падымаюся і бачу, што ўся заля стаіць. Вяртаюся зноў да таго капітана і кажу: «Ну што, зьвязаў? Ты лепш падыміся ў залю — там усе танчаць. Паўтары тысячы чалавек. А ты зараз аднаго арыштуеш?» І гэты міліцыянт падумаў: «Ну… калі ўся заля. Ідзі адсюль! — на гэтага маладзёна. — Ідзі. Усё. Свабодзен!»

Разумееш, гэта ўсё мэнтальнасьць: сказалі нельга — значыць нельга. Калісьці былі «Рок-каранацыі», у праходзе стаяў шэраг АМАПу. Чалавек ускоквае, каб патанчыць, а яму адразу дубцом у плечы — бах! Гэта ўжо проціпраўна. Увогуле, калі падысьці да гэтых міліцыянтаў і пагаварыць, яны нармальныя людзі… І як успрымаць тое, калі Алег Скрыпка з «ВВ» ходзіць пад канец канцэрту па крэслах у залі, абдымаючыся з гледачамі і распяваючы пра сваіх музыкаў, а нашыя ў залі заваражана глядзяць: ах, які сьмелы!?

**«НН»: Што скажаш наконт разьвітога шоў-бізу ў Беларусі сёньня?**

**А.П.:** Мне даспадобы браты Хлястовы. Мне падабаецца тое, што робіць Хлястоў-малодшы, бо няма гэтага, як цяпер модна казаць, піяру. Хлопец проста выдаў свой альбомчык у той нішы, у якой ніхто нічога не займае. І яго слухаюць, купляюць і сьпяваюць. Дзімка Вайцюшкевіч добра распрацоўвае ніву гарадзкога рамансу, шансону. Кірыла Слуку можна прыгадаць яшчэ… А на пытаньне «Чаму ў Беларусі няма шоў-бізу?» адкажу так. У нас усё зыходзіць з палітыкі: калі ты больш-менш пасьпяховы бізнэсовец, дык трэба праверачку адну, другую, падатковую інспэкцыю. Праз два дні — у Дэпартамэнт фінансавых расьсьледаваньняў, потым — прэзыдэнцкая камісія… А паміж гэтым пажарныя, санэпідстанцыя ходзяць. І ўсім трэба даваць, даваць. Дзякуй богу, я праз гэта не праходзіў, бо ў мяне няма офісу. Мой офіс — мая вуліца.

**«НН»: Ад палітыка-музычных пытаньняў — да больш прыемных. Віншую, хоць і запозьнена, з нараджэньнем дачкі!**

**А.П.:** Дзякуй! Дачцэ ўжо чатыры месяцы. Шкада, што няшмат часу адводжу для яе… Я ж бацька, мушу ўсё-такі палюляць лялю. Прыходзіцца шукаць кампрамісы паміж публічнасьцю і сям'ёй. Жонка абураецца, што мяне часта не бывае ў хаце, але, здаецца, дачка пачала тату пазнаваць… Апошнім часам. (*Вельмі радасна сьмяецца.*)

**«НН»: Мо пераключышся на дзіцячыя песьні?**

**А.П.:** Калыханкі дакладна не напішу, бо няздольны. Гэта ўсё асабіста: некага «прабівае» пісаць такія «А-а!» («Пацалаваць мне хочацца дочкі тваей глаза…»). Спадзяюся, дачцэ пашчасьціць і з настаўнікамі, і з жыцьцём, і зь сябрамі. Вельмі хочацца, каб пашчасьціла. Выхаваньне — гэта ня толькі сям'я, маці ды бацька. Гэта яшчэ і тое, дзе ты жывеш, на якой вуліцы, што за дрэва пад тваім акном… Гэта ўсё.

**Гутарыў Юрась Бусел**

ДЫСКАГРАФІЯ

## SankiCrew




Куклы. «Вэст-рэкардз», 2004

«Куклы», і так даволі папулярная ў андэрграўндных колах каманда, выклікала хвалю цікавасьці да сябе заявай Макса Мірнага. Знакаміты спартовец наведаў акцыю «Генэралы айчыннага року» і сказаў журналістам, што прыйшоў паслухаць сваіх сяброў з гурту «Куклы». Дарэчы, гэтая каманда была тады адной зь нешматлікіх, якія годна прайшлі праверку Лядовым палацам: і выкананьне, і гук у «Кукал» былі на ўзроўні. Прафэсійнае стаўленьне гурту да сваёй працы падкрэсьлівае і гэты дыск, у які ўвайшлі новыя песьні, рэміксы, жывы трэк і кавэр «NRM» «На вуліцы маёй». Усё смачна сыграна і запісана ў модным цяпер у Заходняй Эўропе кірунку нью-мэтал.

Наўрад ці «SankiCrew» можна лічыць паўнавартасным альбомам, гэта хутчэй невялічкая справаздача перад прыхільнікамі за той час, што прайшоў пасьля альбому «Гукавая зброя», адзначанага на «Рок-каранацыі'2002». Такая музыка можа зацікавіць ня толькі прыхільнікаў жорсткага гард-кору, але і клюбную «кіслотную» моладзь.

Паводле традыцыі адна з новых песень беларускамоўная («Кібэр»).

Дыск уключае таксама флэш-прэзэнтацыю гурту і відэа.

## Drum Ecstasy




Drum Ecstasy. «Вэст-рэкардз», 2004

Глябальны альбом з кампазыцыямі розных гадоў. Музыканты лічаць гэты безназоўны альбом сваім першым сур'ёзным запісам за 12 год існаваньня.

Гурт зьявіўся яшчэ ў верасьні 1992 г. Хлопцы не хацелі бавіць час на дыскатэках пад тагачасныя мэлёдыі ды рытмы зарубежнай эстрады накшталт «Айс Эм Сі» ды іншых дакраў Альбанаў, таму вырашылі самі стварыць «музыку для ног». Напачатку гурт меў даволі мудрагелістую назву — «Група імя каралеўскага геаграфічнага аб'яднаньня, што выступае ў стылі барабаннага экстазу». Вядома ж, праз некаторы час давялося яе скараціць і пакінуць толькі апошнія два словы. Ідэя «Drum Ecstasy» — у выкананьні танцавальнай трансавай музыкі на акадэмічных ударных інструмэнтах. Музычная аснова ансамблю — некалькі барабанаў і бас-гітара. У гэтым і ўнікальнасьць музычнай прапановы, прычым ня толькі для Беларусі, але й для астатняга сьвету.

Як гэта часта бывае ў айчыннай музыцы, унікальнасьць нашых музыкаў зразумелі спачатку на Захадзе. Ужо ў сакавіку 1993 г. група дала канцэрт у Бэрліне, потым пастаянна выступала на розных імпрэзах у іншых краінах Заходняй Эўропы. Менскім гледачам «Drum Ecstasy» вядомыя з штогадовых выступаў пад мостам у парку Горкага, у сталічных перахода́х, на рознага кшталту шоў («Рок-каранацыя», «Ноч пажыральнікаў рэклямы», «Крамбамбуля»).

Шалёныя барабанныя рытмы, сьветавая ілюмінацыя, слайд-шоў, танцы са сьцягамі — вось складнікі непаўторных выступаў групы. Гэта адзін з тых гуртоў, які варта слухаць ужывую.

Акрамя сталых удзельнікаў гурту Філа Чмыра, Аляксандра Краўцова, Андрэя Чугунова ў вар'яцкіх выступах «Drum Ecstasy» часьцяком бяруць удзел Валік Грышко ды былы бубнач «Троіцы» Зьміцер Лук'янчык. Сёлетні рэліз — справаздача за апошнія некалькі апошніх год існаваньня калектыву. Для альбому запісана некалькі вядомых кампазыцый розных гадоў, дыск зьмяшчае таксама мультымэдыйную частку з фота, відэа і MP3-запісамі гурту.

**Сяргей Будкін**

Найлепшая хрэстаматыя па беларускай літаратуры




кожнаму абітурыенту

## Трасянка — гэта зьдзек

Калі пачынаеш размаўляць па-беларуску, частка людзей зьдзіўлена паглядае ў твой бок, а некаторыя ўвогуле не разумеюць. Яны лічаць, што самі размаўляюць чыста па-расейску, але ці так гэта на самай справе? На якой мове размаўляюць беларусы?

«Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб ня ўмёрлі», — наказваў беларускі клясык Ф.Багушэвіч. Але ягоная парада пыліцца недзе на кніжных паліцах. На ўроках беларускай літаратуры школьнікі штогод пішуць сачыненьні наконт заняпаду мовы, вось тады і адшукваецца «Дудка беларуская», каб перажыць свой кароткачасовы трыюмф. А далей — зноў цёмныя глыбіні кніжнай шафы...

Хочацца крыкнуць: «Людзі, адумайцеся! Гэта ж ня толькі мова праходзіць у заняпад! Гэта ж мы адыходзім у нябыт...» Як жа нас будуць паважаць іншыя, калі мы самі сябе не шануем?! Можа, некаторыя папраўдзе лічаць, што размаўляюць па-расейску? Калі б размаўлялі па-расейску, знайшлі б, напэўна, супольную мову з Расеяй...

Нельга назваць тую мову, што чуваць у Беларусі, ні расейскай, ні беларускай. Тое, што ў народзе клічуць «трасянкай», — бессаромны зьдзек з абедзьвюх моў. Калі сёньня мы страцім мову, то заўтра страцім культуру, самабытнасьць... А ці застанецца тады беларускі народ? Можа, праз колькі год нашчадкі будуць шукаць нас у энцыкляпэдычным слоўніку на літару «Б»?

Людзі, адумайцеся!

**Кацярына Крыванос, школьніца, Менск**

## Удасканаленьне нашай лацініцы

Хачу прапанаваць зрабіць чарговы крок па ўдасканаленьні нашай лацініцы. У свой час увядзеньне літар «č», «š» зрабіла правапіс больш фанэтычным, увядзеньне «v» замест «w» дыктавалася эканоміяй месца. Чаму б не прадоўжыць рацыяналізацыю? Прапаную пісаць «dź», «ć», «ź», «ś», «ń» паўсюль у словах, дзе гукі, што абазначаюцца гэтымі літарамі, мяккія (напрыклад, «śešći»). Па-першае, гэта падкрэсьлівала б іх асаблівае сярэднеязычнае вымаўленьне. Па-другое, такая рацыяналізацыя зноў жа робіць правапіс больш фанэтычным. Па-трэцяе, калі гэтыя гукі стаяць перад галоснымі, то няма патрэбы паказваць іх зьмякчэньне праз «і», а гэта вядзе да эканоміі месца (напрыклад, слова «ziaziula» на дзьве літары даўжэйшае за «źaźula»). Па-чацьвёртае, гэткае напісаньне аддаліць нашу лацініцу ад польскай. Так ужываюць гэтыя літары, дарэчы, сэрбы-лужычане. Мінусаў пры такім спосабе пісьма я ня бачу, але хачу пачуць іншыя меркаваньні.

**Ю.Агіевіч, Берасьце**

## У Слуцку паняверка

У адной з рэгіянальных расейскамоўных газэт, што выходзіць у горадзе раз на тыдзень, яе няштатны аўтар, які вядзе паэтычную рубрыку, надрукаваў чарговы верш «Кое-что об апреле», задаўшыся мэтай засьведчыць, якія знакамітыя людзі нарадзіліся ў гэтым месяцы. Успомніў Напалеона, расейскіх цароў Аляксандра II і Кацярыну, потым кінуў вока на Людовіка, Кромвеэля, Бісмарка, Хрушчова і, як ні дзіўна, Гітлера. Затым нагадаў чытачу, што «родился в апреле Ленин, предназначением судьбы подняв полмира на дыбы». Дарэчы, гэтыя «дыбы» каштавалі Расеі 13 мільёнаў жыцьцяў, загубленых у агні грамадзянскай вайны, ад голаду і тыфу.

Далей пайшлі вершаваныя радкі зь пералікам знакамітасьцяў багемы — Кіркорава, Алы Пугачовай, Шэкспіра і Рахманінава, Чарлі Чапліна, Канта, Калюмба, Вэрдзі, Хана Андэрсэна і Леанарда да Вінчы. На адным дыханьні і не пералічыш. Вось толькі ў свае, беларускія «сьвятцы» аўтар не палічыў патрэбным зазірнуць. А дарэмна! Праявіў бы ён цікавасьць да нашых знакамітасьцяў, то мог бы даведацца (а зь ім і тысячы чытачоў гэтай папулярнай сярод моладзі газэты), што ў красавіку нарадзіліся вядомыя беларускія пісьменьнікі, ахвяры сталінскага генацыду Платон Галавач, расстраляны ў 1937 г., і аўтар першага літаратурнага дакумэнтальнага твору пра канцлягер у Салаўках «У капцюрох ГПУ» Францішак Аляхновіч, 100-я ўгодкі з дня нараджэньня якіх адзначаліся нядаўна ў незалежным друку. А яшчэ варта было ўспомніць і нашага славутага прарока, вестуна незалежнасьці Беларусі Зянона Пазьняка, якому 24 красавіка споўнілася 60 гадоў.

Неяк завітаў у дом культуры ў адным з новых мікраёнаў гораду. І зьдзівіўся, убачыўшы, што ўсе шыльды над уваходам у яго, на дзьвярах кабінэтаў, авбесткі аб наборы моладзі ў самадзейныя гурткі — спрэс расейскамоўныя. І калі спытаў у дырэктара гэтай культустановы, маладога чалавека гадоў за трыццаць, ці не прыйшла пара замяніць усё на беларускі лад, ён спакойна, з ноткай перакананасьці ў голасе адказаў: «А зачем? Ведь республика всё равно войдёт в состав России, это неизбежно».

Ён нагадваў мне ў той момант тых салдатаў першага году вайны, якія, убачыўшы здалёку немцаў, узьнімалі рукі і здаваліся ў палон. Болей размаўляць з тым дырэктарам расхацелася.

**Міхась Кутнявецкі, Слуцак**

## Чаму нам патрэбна незалежнасьць

Каб усьвядоміць неабходнасьць незалежнасьці, трэба зьвяртацца да гісторыі, якая на вопыце мінулых часоў вучыць, як жыць і паводзіць сябе ў будучым, каб не паўтараць памылак продкаў і выкарыстаць усё лепшае, што адпавядае інтарэсам нацыі.

У сувязі з утварэньнем так званай «саюзнай дзяржавы» ў галаву прыходзяць такія добра вядомыя гістарычныя факты. Цар Аляксей Міхайлавіч (Найцішэйшы) зьнішчыў палову беларусаў, а сам Пётар I разам са швэдамі — кожнага трэцяга. Калі Беларусь апынулася ў складзе Расеі, дык у час вайны з Напалеонам быў зьнішчаны кожны чацьвёрты беларус, а колькі было зьнішчана паўстанцаў Тадэвуша Касьцюшкі і Кастуся Каліноўскага — ніхто не лічыў. У час першай сусьветнай вайны Беларусь была разрэзана лініяй расейска-нямецкага фронту з усімі несуцяшальнымі вынікамі, што выцякаюць адсюль.

Бальшавіцкая ўлада, якая прыйшла з Расеі, раскулачыла кожнага шостага беларускага селяніна, а ў Курапатах зьнішчыла амаль чвэрць мільёна чалавек, ня кажучы ўжо пра апошнюю вайну, якая забрала кожнага трэцяга беларуса.

Вось так гісторыя і дае адказ, ці патрэбна нам так званая «саюзная дзяржава», асабліва з улікам пагадненьня аб вайсковым супрацоўніцтве Расеі і Беларусі. У той час калі Расея ўжо каторы год вядзе вайну ў Чачэніі, і канца гэтай вайны не відаць, і немаведама, якія яшчэ ў Расеі будуць войны.

Гісторыя пераканаўча вучыць, што нам вельмі патрэбна гістарычная памяць і незалежнасьць.

**Мікалай Кукса, Івянец**




## Праект адміністрацыйнага падзелу

Пасьля 1991 г. час ад часу пачалі ўзьнімаць пытаньне пра новы адміністрацыйны падзел Беларусі. Сур'ёзна гэта тэма яшчэ не разглядаецца. Але што зьмены раней ці пазьней адбудуцца, сумневу няма. Натуральна, ініцыятыва будзе зыходзіць з афіцыйнага боку. І пра захаваньне нейкіх рэгіянальных асаблівасьцяў гаворкі ісьці ня будзе. Хутчэй за ўсё, як і за каляніяльнымі часамі, Беларусь перадзеляць так, каб зручней было «рукавадзіць праізводствам», не беручы да ўвагі ані гісторыі, ані культурных геаграфічных асаблівасьцяў кожнай мясцовасьці.

Чарговы раз прачытаўшы ў «НН» пра магчымы перадзел адміністрацыйных межаў, я вырашыў стварыць уласны праект адміністрацыйнае рэформы.

Я паспрабаваў вярнуць на карту краіны традыцыйныя назвы і ўмоўна падзяліў Беларусь на сем буйных геаграфічных рэгіёнаў, якія не зьяўляюцца адміністрацыйнымі адзінкамі. Гэта Заходняе Палесьсе, Крывічы (альбо Паазер'е), Літва, Нальшаны, Радзімічы (альбо Падняпроўе), Сярэдняя Беларусь, Усходняе Палесьсе.

Уласна адміністрацыйны падзел уключае ў сябе 19 паветаў. Права быць сталіцамі паветаў надаецца найбольш старажытным местам (Наваградку, Тураву ды інш.).

Такі варыянт адміністрацыйнага падзелу быў бы аптымальным для жыхароў. Цяпер ня вельмі зручна соўгацца па пэўных справах «у вобласьць», за сотні кілямэтраў. Бо амаль усе абласныя цэнтры (апроч Менску) месьцяцца на ўскраінах сваіх рэгіёнаў. А новы падзел, апроч усяго, паспрые ажыўленьню некаторых занядбаных цяпер местаў ды мястэчак.

Мову мы ўжо ўзбагачаем на старонках «НН». Трэба брацца й за дзяржаваторчасьць. У будучыні прыдасца.

**Яўген Саляйчук, Пінск**

ВОДГУКІ

## Шаноўны сп. рэдактар!

У нумары ад 14 траўня (публікацыя «Асамблея зачыненых арганізацый») у поўнай неадпаведнасьці з рэчаіснасьцю сьцьвярджаецца: «Але ў апошні момант А.Анціпенка сам вырашыў не рабіць прэзэнтацыі (маецца на ўвазе «Стратэгія разьвіцьця НДА і незалежных мэдыяў у Беларусі». — **А.А.**) з прычыны таго, што канцэпцыя не магла быць прынятая як папярэдне няўзгодненая».

Такога рашэньня я не прымаў. Я таксама не разьлічваў на тое, што стратэгія будзе ўхвалена. Задача палягала толькі ў прэзэнтацыі «Стратэгіі...», якую з ініцыятывы Беларускай асацыяцыі рэсурсавых цэнтраў і мэўся зрабіць на кангрэсе сп.М.Жбанкоў. Але прэзэнтацыя і абмеркаваньне стратэгіі былі заблякаваны на пасяджэньні адпаведнай сэкцыі кангрэсу НДА.

**З павагай, Алесь Анціпенка**

## Нераток Сёмуху

Дзякую Васілю Сёмуху за добрыя словы. Здаецца, мы ўсе (Сёмуха, Галубовіч, Нераток) сытуацыю разумеем аднолькава. І толькі шчыміць успамін, калі жонка беспрацоўнага пасьля «крынічнага» дэмаршу Галубовіча з гонарам мне паказвала толькі набытую Біблію на беларускай мове.

**Юрась Нераток, Менск**

## Родны і практычны

Усё часьцей на вуліцах, гуляньнях, у спорце застракацелі чырвона-зялёныя сьцягі. Фабрыка іх пашыву працуе на ўра. Аднак браку дае... Не аднойчы бачыў пашытыя дагары нагамі стужкі. «Сьвятая рэліквія», якую правільная дырэктарка школы 10 хвілін устаўляе ды распраўляе сваімі рукамі, пасьля годна лунае дагары нагамі. А можа, на фабрыцы змова? Працуюць злыя апазыцыянэры?.. Куды прасьцей было б з родным бел-чырвона-белым.

**Аляксей, Жодзіна**

## Мяне пахрысьцілі ў праваслаўе, але я каталічка

Паважаны дыякан Андрэй Кураеў («Візыт папы ў Беларусь магчымы», №14), Вы бачыце ў чужым воку парушынку, а бервяна ў сваім не заўважаеце. Зірніце на гісторыю сваёй расейскай праваслаўнай царквы. Яна заўсёды была палітызаваная і шла поруч зь дзяржавай, і цяпер тое самае — пагадненьні, пасяджэньні, уручэньне ордэнаў. Навязваеце сябе, асабліва ў Беларусі. Баіцёся, каб у нас не было, як ва Украіне, але гвалтам мілы ня будзеш. Трэба адкрыць сэрца Богу, каб зьявілася вера, а не бізуном заганяць, як пры Кацярыне.

Хто даў Вам права казаць, што, калі мяне пахрысьцілі ў праваслаўнай царкве, то я ваша? Мяне хрысьцілі перад Богам, а перад Богам усе роўныя і па нацыі, і па веры, і па чыне. Цяпер я сем гадоў хаджу ў касьцёл і гэтым ганаруся: я спасьцігнула тое, пра што раней ня ведала, я сьпяваю цудоўныя песьні-хвалы Богу на роднай беларускай мове. У касьцёл я хаджу не «пасядзець», як Вы выказаліся. Я ўсёю Эўхарыстыю стаю на каленях перад Богам.

Я сустрэла абазнаных каталіцкіх сьвятароў, я сыпасьцігаю Біблію і гэтым набліжаюся да Бога. Пры тым шмат чытаю праваслаўных кніг, вельмі разумнага а.Меня, сьв.Феафана, адначасова слухаю казаньні пратэстанцкіх пастыраў па тэлебачаньні, бяру ўсё разумнае і сьветлае, каб спасьцігнуць лепш Бога. У некаторых кнігах Вашых выдавецтваў падкрэсьліваецца, што Ваша праваслаўная вера лепшая за іншыя, а вось каталіцкая — гэта келска. Адкуль такая нянавісьць да каталікоў, дый хто даў Вам права судзіць?

Ды ў мяне ёсьць параўнаньні не на вашу карысьць. Пасьля царквы людзі выходзяць, нібы ім засталося тры дні да сьмерці, а ўсё праз тое, што ня ведаюць Сьвятога Пісаньня, а я пасьля касьцёлу радуюся жыцьцю. І ў вас чамусьці ўсе малітвы за праваслаўных хрысьціян, а ў касьцёле моляцца за ўсіх людзей, і ніколі ня чула, каб толькі за «каталіцкіх хрысьціян». І яшчэ не разумею, чаму ў царкве бяруць грошы за таемствы (хрост, споведзь і інш.). Так, людзі павінны самі даваць ахвяру, але ўсталёўваць таксу за таемствы — гэта не па-боску. Хрыстос сказаў: «Дарам даў Вам, дарам і аддавайце».

Я схіляю галаву перад Папам Янам Паўлам II за ўсё, што ён зрабіў і робіць на сваім шляху. Ён за ўсе грахі сваёй царквы, за ўсе стагодзьдзі пакаяўся перад сьветам, а тое, што адбылося ва Украіне, — гэта называецца аднаўленьнем справядлівасьці. Яны вярнулі сабе хаця б частку таго, што вы ў іх забралі, што ім належала. Вашай жа царкве ёсьць у чым каяцца перад людзьмі...

І ніколі не кажыце, што Беларусь — гэта вашы прасторы. Беларусь ніколі не была вашай і ня будзе. У Беларусі Расейскую праваслаўную царкву называюць беларускай, але гэта няпраўда. Ёсьць расейская праваслаўная царква Маскоўскага патрыярхату ў Беларусі, а сапраўдную беларускую праваслаўную царкву душаць у зародку, як і ўвесь прагрэсіўны народ.

**Вера Шульгоўская, Магілёў**

## Уладзе і апазыцыі трэба ісьці насустрач

Адгукаючыся на артыкул «Нататкі аб пазыцыі», хачу сказаць, што апазыцыя не займаецца вялікай колькасьцю патрэбных дробных спраў. Акрамя таго, апазыцыя — якая сьляпая наіўнасьць! — спадзяецца, што пры замене прэзыдэнта на некага іншага ўдасца вырашыць адразу ўсе праблемы. Аднак магчыма замена цяперашняга прэзыдэнта на прадстаўніка расейскай алігархіі, які пры неабходнасьці ўсталюе элемэнты фашысцкага рэжыму, будзе нішчыць апазыцыю фізічна! Калі ў Эўропе дэмакратычны лад, то гэта ня значыць, што ён хутка і лёгка прыйдзе да нас.

Сёньня апазыцыі трэба шукаць пункты судакрананьня з прэзыдэнтам. Бо і тая, і той зацікаўлены, каб да ўлады не прарваўся крымінал. І тая, і той павінны быць зацікаўлены ў выхадзе дзяржаўных структур з эўрапейскай ізаляцыі.

Бо ж апазыцыя да ўлады цяпер вельмі моцная. Яна аб'ядноўвае тых людзей, хто любіць Беларусь. Патэнцыял гэтай групы не скарыстаны. Але яна зьяўляецца тым скальным грунтам, на які можна абаперціся пры пабудове ўласнай дзяржавы.

Гэтыя людзі чакаюць ад улады падтрымкі беларускай мовы, беларускай культуры, дзяржаўных крокаў па разьвіцьці беларускага пісьменства, кінэматографу, беларускага тэлебачаньня, беларускай адукацыі — крокаў па ўмацаваньні дзяржаўнасьці. Галоўнае для іх, каб была свая дзяржава, бо толькі так нацыя можа захавацца. Бо на чужым караблі будзе месца толькі ўнізе, у труме, каля самага дна, дзе шанцы на выжываньне найменшыя.

Непатрыятычная ж большасьць, як паказалі падзеі пры разбурэньні Савецкага Саюзу, ніколі ня будзе абараняць уладу і дзяржаву, для такіх людзей мае каштоўнасьць толькі іх уласнае прыватнае жыцьцё. Яны і сёньня марыць нехаць зьехаць — ці то ў Канаду, ці ў Нью-Йорк. Іх лёгка купіць, ці запалохаць, ці ззамбаваць. Уладу яны прымуць любую.

У грознай будучыні дзяржаўнасьць могуць абараніць толькі патрыёты.

**Кастусь Травень, Ворша**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Чый апостал і геній?

## Сёе-тое пра беларускую міталёгію

Яшчэ нядаўна мы былі сьведкамі няўдалага нараджэньня міту пра кажушок ад Янкі Купалы — як ён, гэты кажушок, трапляў у вязьніцу то да Аляксандра Ўласава, то да Антона Луцкевіча. Мажліва, трапіў бы ён і да кагось іншага з нашаніўскае плеяды, калі б ня новы час і не параўнальная свабода слова. У савецкі час гэты «кажушок ад Купалы» маглі б і пракаўтнуць: надта ж ён працуе на імідж паэты. А пра імідж дбалі, яго ахоўвалі. Шкадую, што Янка Саламевіч да гэтае пары не напісаў, як у 1982 г. незабыўная Вера Палтаран, загадчыца рэдакцыі крытыкі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура», прыгладжвала кніжку «Ўспаміны пра Янку Купалу» (рэдактары Алесь Разанаў і Генадзь Шупенька). Вера Сямёнаўна галоўным чынам сачыла, ці не прапусьцілі дзе яе падначаленыя згадку пра чарку. Купала і чарка — гэта несумяшчальна, гэта нельга было пусьціць у друк. Такі быў ня Вераю Палтаран устаноўлены канон. Яшчэ адзін няўдалы міт.

Такая ўжо прырода чалавека: ня можа ён бязь мітаў.



**Дажынкі ў Багданаве, маёнтку Рушчыцаў. У першым шэрагу пасярэдзіне — Эдвард і Альвіна, бацькі мастака. Фэрдынанд першы з правага боку. 1908 год.**

### У даўняй Вільні

У нашым выпадку мы маем такую гісторыю. Чалавек, ад дзеда-прадзеда тутэйшы, далёкія продкі якога былі праваслаўныя і мелі трохі іншае прозьвішча (замест польскага *ц* на канцы было нашае *ч*), нарадзіўся ў польскамоўнай сям'і. Як і дзясяткі дзеячоў беларускае культуры пачатку XX ст. Сям'я жыла згадкамі пра Рэч Паспалітую і пра Вялікае Княства Літоўскае. Гэтае ліцьвінства перадалося і нашаму герою. Сям'я жыла згадкамі пра паўстаньні. Імёны Тадэвуша Касьцюшкі, Эміліі і Лявона Плятэраў былі ў ёй сьвятыя. Паколькі сям'я належала да прыгнечанай нацыі і культуры, яна не магла ня быць дэмакратычнаю. Вось гэтае спалучэньне ліцьвінства (адчуваньне сябе спадкаемцам Вялікага Княства) з дэмакратызмам і спрычынілася да таго, што чалавек стаў краёўцам.

Як краёвец і дэмакрат, ён меў «вялікае замілаваньне да краю і шчыры сантымэнт да беларускага люду, глыбокую цікавасьць да беларускае песьні, паэзіі і ўжытковага мастацтва». Ён наведваў Івана Луцкевіча ў рэдакцыі «Нашае Нівы» і цікавіўся ягонаю калекцыяй беларускага мастацтва. Сам мастак, ён дапамагаў афарміць першы беларускі каляндар «Нашае Нівы» і «Кароткую гісторыю Беларусі» Вацлава Ластоўскага. Часта сустракаўся з Антонам Луцкевічам, запрашаў яго на артыстычныя вечарынкі ды імпрэзы. Луцкевіч пазьней прызнаваўся, што «шчырыя ў той час» сымпатыі нашага героя да беларускага адраджэнскага руху «былі падставаю сардэчных… зь ім стасункаў».

Наш герой быў вельмі папулярны ў асяродзьдзі віленскае эліты — беларусаў, палякаў, літоўцаў і жыдоў. Але потым у яго была «гісторыя» з Марыяй Залускай, якая сьпявала ў беларускім хоры Людаміра Рагоўскага. Як успамінаў А.Луцкевіч, яе трагічная сьмерць «астудзіла ў многіх віленчукоў» сымпатыі да нашага героя. І сам Луцкевіч ад тае пары сустракаўся зь ім «вельмі рэдка — мімаходам» (*przelotnie* — напісана ў ягоных успамінах).

### У «чыста польскім горадзе» Вільні

Наш герой сталеў. Малады рамантызм зь яго сантымэнтамі спакваля зьнікаў. А тут і жыцьцёвыя абставіны рэзка памяняліся. Прайшла сусьветная вайна. А вынік гэтае і савецка-польскае вайны быў той, што «паўсталі новыя варункі жыцьця для Вільні і віленчукоў, якія адных паставілі ў шэраг уладцаў нашага краю, а другіх залічылі ў гэлёты (ілоты. **— заўв. рэд.**) ва ўласнай айчыне».

Гэлётамі сталі беларусы, літоўцы і жыды. Для палякаў жа настала эра справядлівасьці. Як піша доктар Захар Шыбека, нават польскія сацыялісты марылі пра такі справядлівы сьвет, у якім усе гавораць па-польску. І хоць ідэал спраўдзіўся ня цалкам, яны — учарашнія дэмакраты, сацыялісты і рэвалюцыянэры — былі «п'яныя з тае прычыны, што здабылі свабоду для сябе».

Перад спакусаю стаць уладцамі змаглі ўстаяць толькі адзінкі з польскамоўных краёўцаў: адвакат Тадэвуш Урублеўскі, пляменьнік знакамітага Валяр'яна Ўрублеўскага і заснавальнік славутае бібліятэкі, рэдактар Людвік Абрамовіч… Для ап'янелае кампаніі яны сталіся парыямі, бо па-ранейшаму змагаліся, кажучы словамі А.Луцкевіча, «за *адну* праўду і *адну* волю для ўсіх».

Наш герой перад спакусаю не ўстаяў, ён таксама ап'янеў. Польскі нацыяналізм выйшаў вонкі. Ягонае «вялікае замілаваньне да краю» ўжо тлумачылася тым, што гэты край — «polska ziemla», якая знаходзіцца на тэрыторыі польскае дзяржавы. Ягоная любоў да Вільні цяпер тлумачылася тым, што гэта — паводле афіцыйнае вэрсіі — «чыста польскі горад». Ён узначаліў Таварыства замілаваных Вільняю — «Towarzystwo Miłośników Wilna» і стаў прафэсарам адроджанага Віленскага ўнівэрсытэту, якому было нададзена імя Сьцяпана Баторы.

У 1918 г. сьмяротна хворы І.Луцкевіч робіць, «бадай, апошнюю памятку па сабе беларускаму народу» — дамагаецца ў нямецкіх уладаў дазволу на адкрыцьцё ў Базыльянскіх мурах Віленскае беларускае гімназіі. Прыйшоўшы ў горад, бальшавікі не скасавалі гэтага рашэньня. І польскія ўлады падчас першае акупацыі Вільні. І зноў бальшавікі. І літоўская ўлада. А ў кастрычніку 1920 г. горад захапіла беларуска-літоўская дывізія генэрала Люцыяна Жалігоўскага. Была абвешчана Сярэдняя Літва.

Тады і пачалося.

Дамо слова сьведку. Антон Луцкевіч піша: «У 1920 годзе на адным з засяданьняў віленскае Мястовае Рады сябра яе, Вацлаў Студніцкі, падаў сьпешную прапазыцыю, у якой дамагаўся, каб Базылянскія муры (Вастрабрамская, 9), дзе зьмяшчаюцца беларуская культурна-прасьветныя ўстановы (гімназія, навуковае т-ва, музэй і т. п.), былі адабраны ад беларусаў і перададзены ў рукі польскага грамадзянства. Радны Студніцкі заявіў, што расейская ўлада зьбясчэсьціла вязьніцу Адама Міцкевіча, якая знаходзіцца ў гэтых мурох, абярнуўшы яе ў клязэты, а беларускае грамадзянства, хаця аб гэтым добра ведае, усё ж захоўвае вязьніцу вялікага песьняра ў такім стане і далей.

Трэба адзначыць, што п.Студніцкі не падаў Мястовай Радзе ніякіх доказаў таго, што гэта — праўда. Наадварот: незадоўга перад тым — у часе агляду Базылянскіх муроў групай прафэсароў Віленскага ўнівэрсытэту, ён пры многіх сьведках адкрыта прызнаваўся, што ня ведае, дзе мог сядзець Міцкевіч. Аднак на засяданьні Рады п.Студніцкі гаварыў аб сваім «адкрыцьці» з такой пэўнасьцяй, што радныя, чуўшыя аб падобнай прафанацыі камэры Траўгута ў варшаўскай цытадэлі, паверылі яму на слова і прапазыцыю ўхвалілі, не пытаючыся аб довады».

Сярод тых прафэсараў быў і славуты польскі тэкстоляг, рэдактар і камэнтатар збораў твораў клясыкаў Станіслаў Пігань. Польскі патрыятызм не дазволіў па-навуковаму падысьці да пытаньня пра вязьніцу Адама і клязэты. Гэты абавязак узяў на сябе А.Луцкевіч, які з дапамогаю дырэктара гімназіі Міхала Кахановіча, кс.Адама Станкевіча, архітэктара Лявона Дубейкаўскага і інжынэра Антона Трэпкі дакладна ўстанавіў месца зьняволеньня паэта. Гэтым ён адстаяў гонар беларусаў як культурнае нацыі. Ягоную працаю «Вязьніца Адама Міцкевіча» (польскае выданьне выйшла пад назвам «Prawda o celi Konrada: W setną rocznicę procesu filomatów») мы можам ганарыцца як укладам у міцкевічазнаўства.

Антон Луцкевіч напісаў у абарону Базылянскіх муроў не адзін артыкул. І пакуль трывала Сярэдняя Літва, улада яшчэ вагалася, але пасьля далучэньня яе да Польшчы сіла перамагла права і мараль. У ліпені 1923 г. дэлегат польскага ўраду ў Вільні выдаў «orzeczenie», паводле якога Базылянскія муры пераходзілі ва ўласнасьць дзяржавы.

Ня ведаю, ці быў сярод тых прафэсараў Віленскага ўнівэрсытэту і наш герой. Затое напэўна вядома, што ўзначаленае ім «Towarzystwo Miłośników Wilna» ад самага пачатку, як і пан Вацлаў Студніцкі, дамагалася перадачы Базылянскіх муроў «у рукі польскага грамадзянства». Пра нейкую асаблівую пазыцыю старшыні Таварыства крыніцы не паведамляюць. Дый ня могуць паведаміць.

І калі пасьля сьмерці Марыі Залускай А.Луцкевіч сустракаўся з нашым героем *przelotnie,* дык пасьля таго як ён адкрыта стаў *ворагам беларушчыны,* стасункі гэлёта Луцкевіча з панам прафэсарам «абмяжоўваліся абменам паклонамі пры спатканьнях на вуліцы». І так доўжылася да канца дзён нашага героя (памёр ён 30 кастрычніка 1936 г.).

### Па часе

Насталі новыя часы. Спакваля да беларусаў пачала вяртацца загнаная ў спэцсховы і спэцфонды їхняя гісторыя. І як гэта звычайна бывае, напачатку панаваў рамантычны падыход да мінуўшчыны. А дадамо, што шмат якія працы папярэднікаў дасьледчыкам папросту былі невядомыя (бібліяграфіяў няма). А пэўныя дасьледчыкі й не падазравалі пра існаваньне папярэднікаў (імёны забароненыя) ды лічылі сябе ці не піянерамі.

Вось у той час вяртаецца і імя нашага героя. І трапляе пад вокладку кнігі Леаніда Дробава «Беларускія мастакі XIX ст.» (1971), выданьня безумоўна каштоўнага, а тады — папросту сэнсацыйнага (я чытаў яго не адрываючыся). А праз 26 гадоў у часопісе «Наша вера» (1997, №1) Яўген Шунейка назваў нашага героя апосталам духоўнасьці. Зробім папраўку на час (тады каго толькі ні называлі апосталамі і прарокамі) ды на спэцыфіку выданьня. Сапраўды, наш герой быў каталіком. Але ўдакладнім: каталіком, хворым на нацыяналізм.

Ня ведаю, ці чытаў хто зь беларускіх дасьледчыкаў дзёньнік нашага героя. Я не чытаў. Затое пазнаёміўся з рэцэнзіяй на яго, якую надрукавала Лена Глагоўская ў беластоцкіх «Białoruskich Zeszytach Historycznych» (1996, №1).

Наш герой выдатна бачыў, што паміж ім, панам, ды беларускім народам — дыстанцыя, і прызнаваўся: «Як і ў 1863 г., … тутэйшы люд нас не разумее». Адзінае, што яго лучыла з гэтым народам, быў *польскі* каталіцызм. І ён канстатаваў: «па-за рэлігіяй» польскасьць для гэтага народу «ня ёсьць чымсьці радасным, вялікім і моцным».

### Без высноў

Сёлета 23 красавіка «Народная воля» на першай паласе паведамляла: «У раёне Старабарысаўскага тракту, непадалёк ад таго месца, дзе будуецца Нацыянальная бібліятэка, ёсьць вуліца імя Фэрдынанда Рушчыца — мастака, якога шануюць як нацыянальнага генія ў Беларусі і Польшчы». 22 красавіка там была вывешана мэмарыяльная дошка, якая «паведамляе аб прыналежнасьці мастака да дзьвюх братніх культур — беларускай і польскай». Напісаў гэтыя радкі мастацтвазнавец Пётра Васілеўскі — аўтар, якога я люблю чытаць.

Такім чынам чалавек, які не пачуваўся часткаю гэтага народу і далучыўся да ворагаў беларушчыны (а гаворка тут увесь час вялася пра Фэрдынанда Рушчыца), трапіў у беларускія мастакі, апосталы і нацыянальныя геніі.

У свой час Зюк (Юзюк Пілсудзкі) быў запісаўся беларусам, у 1919-м прамаўляў у Менску па-беларуску, а ў маладыя гады — гэта таксама засьведчана — распаўсюджваў Багушэвічаву «Дудку беларускую». Ці не аднесьці нам на гэтых падставах Юзафа Пілсудзкага да дзеячоў беларускае культуры?

Як можна бачыць, я не раблю высновы, а паказваю на праблему.

**Анатоль Сідарэвіч**

# «Крамбамбуля» пайшла на апэрытыў

## Алег Скрыпка: «Ва Ўкраіне на радыё толькі 1,5% украінскамоўнае музыкі»

Лявон Вольскі ў пятніцу ў КЗ «Менск» быў выразна не ў гуморы і сьпяваў без натхненьня. Канцэрт «Крамбамбулі» і «Вопляў Відаплясава» быў вялікім, але не супольным.

На перадканцэртную «прэсуху» прыйшоў толькі Алег Скрыпка, саліст «ВВ». Адсутнасьць Лявона зьдзівіла, але пасьля першага пытаньня ўсё стала зразумела: ніякага супольнага праекту «Крамбамбулі» і «Вопляў Відаплясава» не адбудзецца. Алег Скрыпка літаральна пару дзён таму праслухаў запісы «Крамбамбулі» і ў вялікае захапленьне ад гэтага не прыйшоў. «Крамбамбуля» — гэта такі сьмешны рок. Калі ўвогуле рок. Я не артыст размоўнага жанру, як Міхалок. Я не хачу, каб «Воплі Відаплясава» фігуравалі ў нейкім «сьмешным» аспэкце. «ВВ» — гэта не цяжкарокавая Сярдзючка. Аніякай згоды на такі праект я не даваў». Прадусарка «Крамбамбулі» Ганна Вольская кажа, што заява Скрыпкі была нечаканай для беларускага боку, бо папярэдняя дамова з украінскім выканаўцам існавала.

Таксама на прэс-канфэрэнцыі Алег Скрыпка расказаў журналістам пра занядбаны стан украінскага шоў-бізнэсу, у якім ад «уласна ўкраінскага засталася толькі назва». Алег кажа, што ўкраінскія FM-станцыі і музычныя каналы зь неахвотай ставяць у ратацыю музыку на ўкраінскай мове, замяняючы яе на ўкраінскую, але расейскамоўную ці ўвогуле на расейскую. «Сродкаў у расейскіх выканаўцаў болш, таму яны здольныя праплаціць за радыё і тэлебачаньне. Калі тры гады таму ўкраінскамоўнай музыкі на радыё было каля 10%, то цяпер толькі 1,5%».

Кіраўнік «ВВ» зазначыў, што магчымае аб'яднаньне высілкаў беларускіх і ўкраінскіх музыкантаў можа стрымаць экспансію расейскай культуры на рынкі абедзьвюх краін. «Песенная культура ў нашых краінах глыбейшая й прыгажэйшая, чым у Расеі. Калі разам рабіць нейкія праекты, будзе добра». Але ў лідэра «ВВ» два патрабаваньні да такога супольнага праекту: ён мусіць быць сур'ёзным і фолькавым.

А праз гадзіну быў канцэрт, на якім «Крамбамбуля» выступіла ў якасьці апэрытыву. Вольскі сьпяваў адзін, крыху дапамагаў яму Кулінковіч, Міхалок удзелу ня браў. «Настрой у музыкаў быў сапсаваны», — прызнае Г.Вольская.

Між тым, новыя песьні «Суседзі» і «Турысты» ўсё ж будуць запісаны з украінцамі. Праектам цяпер зацікавіліся ўкраінскія групы «Мандри» і «Скрябін». «У выпадку са Скрыпкам мы зрабілі памылку, бо перамовы вялі з гуказапісвальнай кампаніяй, а ня зь ім непасрэдна», — лічыць Яўген Калмыкоў. Адзін з прадусараў «Крамбамбулі» зьбіраецца ў чэрвені наведаць суседнюю краіну для перамоваў.

**Аляксей Мінчонак, Сяргей Будкін**




Заява Скрыпкі, які «не пабачыў сябе» ў прапанаваных для сумеснага выкананьня творах, прымусіла Вольскага разгубіцца.

### КАМЭНТАР «НН»

Артысты, якія не пакаштавалі капіталізму, не задумляюцца, ці вартае іх шоў таго, каб плаціць за яго грошы. Бо ў словазлучэньні «шоў-бізнэс» мы пачасту робім націск на апошняе слова. Скрыпка, які дзесяць гадоў праіснаваў у жорсткіх умовах самаакупнасьці, адпрацоўвае дарагія квіткі на дзьвесьце працэнтаў і таму ня любіць рызыкоўных экспромтаў.

### Ліст музыкаў Кучму

Прадстаўнікі ўкраінскага шоў-бізнэсу зьвярнуліся да прэзыдэнта Ленаіда Кучмы і прэм'ера Віктара Януковіча з просьбай вярнуць на радыё ўкраінскую музыку. Ва Ўкраіне, як і ў Беларусі, закон патрабуе 50% радыёчасу аддаваць айчыннай прадукцыі. Але на 90%, кажуць падпісанты, гучыць замежная музыка. Сярод 100 падпісантаў ліста — Тарас Чубай («Плач Ераміі»), Павал Зіброў і інш.

### «Магутны Божа»

Чарговы фэстываль адкрыўся ў Магілёве і працягнецца да 30 траўня. У ім бяруць удзел хары, а таксама салісты зь Беларусі, Расеі, Украіны, Польшчы, Германіі, ЗША, Балтыі — усяго пад 550 удзельнікаў. Завершыцца ён гала-канцэртам. Журы традыцыйна ўзначальвае Віктар Роўда.

### Героі Монтэ-Касына

У Польскім інстытуце ў Менску адбылася прэм'ера фільму Георгія Бокуна «Забытыя героі», прымеркаваная да 60-годзьдзя бітвы пад Монтэ-Касына. Фільм быў зьняты тэлекампаніяй «ФІТ» на замову расейскага тэлеканалу ТВЦ. Сёньня ў Беларусі застаўся адзін жывы ўдзельнік бітвы. У 1993 г., калі яны былі прызнаныя вэтэранамі вайны, іх было 25.

### Забаронены фільм Мэйрэліша

Фільм Фэрнанду Мэйрэліша «Горад Бога», заяўлены ў кінапраграме «Кінафармат 4х4», забаранілі да паказу на тэрыторыі Беларусі. Такое рашэньне прыняла Рэспубліканская экспэртная камісія па прадухіленьні парнаграфіі й гвалту. Гангстэрская сага распавядае пра гандаль наркотыкамі й вайну паміж бандыцкімі групоўкамі.

### Юбілей Пятлюры

17 траўня споўнілася 125 гадоў з дня нараджэньня Сімона Пятлюры, старшыні Дырэкторыі Украінскай Народнай Рэспублікі. Юбілей сьвяткуюць ва Ўкраіне і ў дыяспары.

**Аркадзь Шанскі**

# Васючэнка пра літаратуру

22 траўня ў Полацку ўручалі літаратурную прэмію «Гліняны Вялес». Ляўрэатам «Вялеса-2003» стаў празаік, драматург, літаратуразнавец Пятро Васючэнка за кнігу казачных аповесьцяў «Жылі-былі паны Кубліцкі ды Заблоцкі».

У сваёй прамове П.Васючэнка распавёў, што летась ён напісаў кнігу «100 найлепшых пісьменьнікаў сьвету ХХ ст.», працуючы над якой выразна прасачыў, што літаратары ХХ ст. у сваіх творах змадэлявалі лёс мінулага веку. Яны прадказалі асноўныя навуковыя і тэхнічныя адкрыцьці, сацыяльныя катаклізмы, антыгуманныя рэжымы з канцлягерамі і катоўнямі, свае асабістыя трагедыі і нават Чарнобыль.

П.Васючэнка ўпэўнены, што ў ХХІ ст. літаратура будзе разьвівацца іншым шляхам — будзе шукаць іншых герояў, мадэляваць іншае, больш гуманнае грамадзтва.

Кніга «Жылі-былі паны Кубліцкі да Заблоцкі» выйшла ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» з надзвычайнымі ілюстрацыямі мастака Ўладзімера Лукашыка. Экспэрты «Вялеса» палічылі, што гэтаму зборніку казачных аповесьцяў наканавана стаць хрэстаматыйнай кнігай беларускай дзіцячай літаратуры. Аўтар абяцае і працяг твору.

**Васіль Кроква, Полацак**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Юбілей пад маразульку

Культура — дэмакратычны вірок у каналізацыйных кратках: старадаўні пярсьцёнак ды мадэрновая налепка маюць аднолькавую вартасьць ды ўцягнуты ў няўмольны танец. На канфэрэнцыі, прысьвечанай 25-годзьдзю Музэю старажытнабеларускае культуры, я адчула тахты сярэднявечнае дыскатэкі, зладжанай «Старым Ольсам». Балазе, прафэсар Х. ды прафэсар П. паспрыялі стварэньню тае атмасфэры, бо зладзілі скокі ў стылі «маразулькі» (два крокі ўлева, два крокі ўправа, прытупваньне, ляскаyьне, воклічы ды шал). Карагодам з элемэнтамі пэрформансу пранесьліся асобы ў традыцыйных строях. Вэстэрнізаваныя польскія госьці традыцыі не падтрымалі й сядзелі, прыціснуўшы вушы.

Мільгане думка: каб чвэрць стагодзьдзя таму фізыкі-рамантыкі не знайшлі 4 драўляныя статуі сьвятых у забытай Богам вёсачцы ды іх не паслаў атэістычны супрацоўнік дзяржаўнага музэю (пэўны, што савецкая ўлада — за яго, а Хрыстос надзейна прыбіты да крыжа), не было б ні гэтае экстрэмальнае імпрэзы, ні музэю, ні бляску тваё фібулы ў нэонавым сьвятле «Рэактару».

А на выставе завісаеш надоўга. Чырвонымі крыжыкамі зеўраць гады змаганьня з уладарнымі цемрашаламі, тканымі пасамі — авантурныя шляхі зьбіральніка, саломкай абручыка — радасьць творцы ды высілкі рамесьніка. Начапіць бы ільняную міні-спаднічку-вышыванку, станчыць «маразульку» ды выправіцца ў этнаграфічную вандроўку. Бо мы — не сьцяблінкі ў віры. «Гэй, ліцьвіны! Бог нам радзіць!»

**АВ, Болачка**

Музэй Старабеларускай культуры пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі й фальклёру Акадэміі навук адзначыў сваё 25-годзьдзе навуковай канфэрэнцыяй. Сёньня ў музэі 16 унікальных калекцый з амаль 30 тыс. матэрыяльных экспанатаў, у тым ліку слуцкія паясы, абразы XVI—XVIII ст., надмагільлі роду Сапегаў. Апроч таго, у запасьніках музэю захоўваецца 13 тыс. фотанэгатываў — фіксацыяў старажытных культурных помнікаў. Асобны разьдзел музэю прысьвячаецца чарнобыльскім раёнам. Да 25-годзьдзя Музэю падрыхтаваная і выстава.

# У горадзе партызаны

Шмат хто зь менчукоў зьвярнуў увагу на тое, наколькі радыкальна папоўніўся асартымэнт гандлю з рук у падземным пераходзе каля ГУМу. Пажылая кабета (паводле некаторых зьвестак — маці мастака Артура Клінава) поруч з напаўлегальнай незалежнай прэсаю прапануе мінакам другі нумар часопісу «pARTisan». Як на мяне, гэта самая ўдалая зьвязаная з «pARTisan'ам» мастацкая акцыя. Проста супэрскі пэрформанс (а калі ўлічваць, што кабета стаіць у пераходзе досыць працяглы час, толькі зрэдку ўцякаючы ад міліцыянтаў, — то і інсталяцыя). Яшчэ ніколі элітарнае мастацтва не хадзіла ў масы так дэманстратыўна. Нам застаецца аднойчы прачнуцца ў электрычцы, пачуўшы гугнявае: «Добры дзень, шаноўныя пасажыры. Прапануем вашай увазе газэту «Куль-тура-а»! Каляровы друк, 16 старонак сьвежых навін опэры, балету і этнаграфіі, адраджэньне архітэктурнай спадчыны і, вядома ж, тэатральная афіша…»

**Марыйка Мартысевіч**

# Глёбус з музыкай

**Сам Глёбус сваіх кніг ужо даўно ня лічыць. Кажа проста — чарговая. Хоць «Дом» адрозьніваецца ад ягоных ранейшых 14 кніг ужо таму, што твор напісаны ў жанры раману. Раней Глёбус пісаў што хочаш, але толькі не раман. «Дом» можна лічыць ня толькі найбуйнейшым творам пісьменьніка, але й першым айчынным інтэрнэт-раманам.**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Тэкст на працягу трох год друкаваўся на літаратурных інтэрнэт-форумах, і наведнікі мелі магчымасьць адразу падзяліцца сваімі меркаваньнямі і нават паўплываць на далейшую хаду падзей. Часткі «Дому» друкаваліся і ў пэрыядычным друку. «Ад папярэдніх маіх кніг гэтая розьніцца перадусім гіпэррэалістычнай падачай матэрыялу», — заўважае пісьменьнік.

Каб давесьці гэтую гіпэррэалістычнасьць, сп. Адам запросіць на прэзэнтацыі герояў раману — жонку Алену, брата Міраслава, маці Ніну, дачку Ядзю і нават унука Вовачку.

Глёбус хоча працягнуць старую і добрую традыцыю літаратурна-музычных імпрэзаў: «Калісьці на прэзэнтацыі кнігі Максіма Танка гралі «Песьняры», бацька на прэзэнтацыю «Чужой Бацькаўшчыны» запрашаў прафэсійных актораў, танцораў і сьпевакоў», — згадвае пісьменьнік. У літаратурна-мастацкай частцы вечарыны самога пісьменьніка гледачы пазнаёмяцца з героямі «Дому», выступяць Уладзімер Арлоў і Зьміцер Вішнёў. У музычнай — будзе сьпяваць «NRM». Рокеры прэзэнтуюць новыя песьні, у прыватнасьці «Ой, бярозы ды сосны» на верш Адама Русака.

Вечарына пройдзе ў вялікай залі Дому літаратара **9 чэрвеня**. Пачатак а 19-й. Уваход вольны.

## Лошыцкі фэст

**30 траўня** а 12-й дзяцей ды іх бацькоў запрашаюць на вясёлы «Лошыцкі фэст».

Гістарычнае сьвята ў Лошыцкім парку ладзіцца з 1995 г., калі там упершыню ў краіне адбыўся рыцарскі турнір, арганізаваны Беларускім рыцарскім клюбам (кіраўніца Арына Вячорка) і Рыцарскім клюбам «Alter Ego» (кіраўнік Дзьмітры Нясьцюк). Першыя пастановачныя конныя паядынкі, каскадзёрскія двубоі, штурмы замку ўпершыню рэалізоўваліся ў Лошыцы. Апошнія гады ў фэсьце бяруць удзел майстры, якія аднавілі рамесьніцкія традыцыі Сярэднявечча.

Фэст пачнецца з прадстаўленьня рыцарскіх клюбаў і рамесьніцкіх гільдый, выступяць тэатральныя, музычныя і танцавальныя калектывы, а ўвечары адбудуцца прэзэнтацыя дыску «Легенды Вялікага Княства» і канцэрт гурту «Стары Ольса». А 13-й пачнуцца рыцарскія турніры, а ў 19.00 — бугурт. У час сьвята працуе кірмаш рамёстваў, гульнёвая паляна і катаньне на конях.

Праезд на сьвята: тралейбус №5, 15, 24 да канцавога прыпынку, аўтобус №3, 3а, 102 да прыпынку «Лошыца» (ад чыгуначнага вакзалу).

## Турнэ «Ляпісаў»

Ня так даўно ў Міры курыца зьнесла самае вялікае ў сьвеце яйка вагой 160 г. «Ляпіс Трубяцкой» вырашыў працягнуць гэты лягічны шэраг і выдаў дыск «Золотые яйцы», прэзэнтацыя якога адбудзецца **3 чэрвеня** ў клюбе «Рэактар». Усе новыя гіты прагучаць у гэты дзень. Можна будзе пачуць жарцікі Міхалка, беларускую мову Булатнікава, кіслотную музыку ды-джэя Лур'е (спэцыяльны госьць з Масквы) і, натуральна, скапанк-фольк-рэгі-шансонны «Ляпіс». Пачатак заплянаваны на 20.00. Квіткі каштуюць 15000 руб. (танцпол) і 22000 руб. (столік).

«Ляпісы» вярнуліся нядаўна з Малдовы, дзе выступалі на цэнтральнай плошчы ў Тыраспалі разам зь мясцовымі зоркамі «Здоб шы здуб». Пасьля менскага канцэрту «Ляпісы» плянуюць выступіць у Віцебску (**2 чэрвеня**, амфітэатар, пачатак а 20-й), у Баранавічах — **11** і **23 чэрвеня** (першы канцэрт плянуецца ў клюбе «New Sound», другі — у ДКТ). Група таксама мае заехаць у Бабруйск, Маладэчна і Магілёў (**24-га, 25-га** і **16 чэрвеня** адпаведна). Ганарар за беларускія рэгіянальныя канцэрты музыкі зьнізілі ўтрая.

### 12+1 у Віцебску

**27 траўня** (чц) у цэнтральнай гарадзкой бібліятэцы — літаратурнае кабарэ. Такую форму абралі арганізатары для творчай сустрэчы зь пераможцамі конкурсу маладых літаратараў імя Натальлі Арсеньневай. Пачатак а 14-й. Вядзе спатканьне крытык Ганна Кісьліцына.

### Вечарына Вайханскіх

**3 чэрвеня** (чц) Галіна і Барыс Вайханскія запрашаюць у Дом літаратара на творчую сустрэчу і прэзэнтацыю новага музычнага альбому «Вяртаньне». Пачатак а 19-й. Уваход вольны.

### Выстава ў «Novie»

**З 4 да 18 чэрвеня** галерэя візуальных мастацтваў «Nova» (вул.Харужай, 16) запрашае на выставу фатаздымкаў Аляксея Андрэева «Дзёньнік адлюстраваньняў». Уваход вольны.

### Жывапіс і графіка Басава

**Да 28 чэрвеня** ў мастацкай галерэі Інстытуту Гётэ (Фрунзэ, 5) — жывапіс і графіка Мацьвея Басава «Тры тысячы гадоў таму». Уваход вольны.

### Жывапіс Аляксея Іванова

**1 чэрвеня** ў галерэі «Онік» сканчаецца выстава жывапісу Аляксея Іванова «Забаронены горад». Даведкі праз т.227-10-75.

### Белагра-2004

**З 8 да 11 чэрвеня** на Машэрава, 14 адбудзецца міжнародная спэцыялізаваная выстава «Белагра-2004» — традыцыйны штогадовы форум работнікаў сельскай гаспадаркі.

### Швэдзкія дні ў Менску

**7 чэрвеня** (пн) а 15-й Беларуская акадэмія мастацтваў (пр.Скарыны, 81) запрашае на творчую сустрэчу са швэдзкім рэжысэрам Янам Труэлем.

### Краіна Астрыд Ліндгрэн

**1 чэрвеня** (аўт), 16.00 — адкрыцьцё выставы «Цудоўная краіна Астрыд Ліндгрэн».

**3 чэрвеня** (чц), 11.00 — акцыя «Сьвята пасьланьняў у іншую краіну».

**4 чэрвеня** (пт), 11.00 — сустрэча з калектывам часопісу «Вясёлка».

**7 чэрвеня** (пн), 11.00 — сустрэча з рэжысэркай-мультыплікатаркай Ірынай Кадзюковай.

Усе падзеі адбудуцца ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры Беларусі

### Вінілавыя Сны

У Тэатры беларускай драматургіі **29 траўня** (сб) — літаратурна-музычны праект: Ліза Солнышкіна і гурт «Вінілавыя Сны». Пачатак а 19-й. Квіткі: 3500 і 5000.

### Вівальдзі-аркестар

**1 чэрвеня** (аўт) — у к/з «Менск» канцэрт Сьвятланы Бязроднай і яе Вівальдзі-аркестру. Квіткі ад 19000 да 57000.

### ДДТ

**6 чэрвеня** (ндз) — у Палацы спорту канцэрт «ДДТ». Пачатак а 19-й. Квіткі: 20000—60000, танцпол — 25000.

## Клюбная афіша

### NC

**29** (сб), 17.00 — Hard Core GiG #1, Devil Shoots Devil (мэлядычны metal-core), «Гвозди» (latino rap-core), «Пульс вокруг» (пазытыўны new-school), госьці зь Вільні «BORO» (metal core). Квіткі: папярэдне 6000, на месцы — 9000. Т.: 752-54-53, 676-08-30, 286-47-39. Электронны адрас: gipsogen@mail.ru.

**30** (ндз) фэстываль «Усе будуць там-2». У праграме — трыб'ют групы «KOЯN», выступы CoRE & RAP выканаўцаў + «B-boys», «Пэрфоманс», «Grafity», шоў скейтбардыстаў, конкурсы тату і пірсынгу. Пачатак у абед. Т.: 757-05-89 (Андрэй), 703-89-47, 792-69-85.

### Акварыюм

**29** (сб) у 18.30 адбудзецца вечарына «One Way Party» пад дэвізам «Дакраніся да лета!». Удзельнічаюць «J.Style» (funk), «Fish.By» (rock), «Touch OFF-Limits» (dance), «Джамбы Бум» (ethno), «Вірус ліха» (reggae), «Честное слово» (rap). Квіткі: 7000, 6000+флаер, 5000 (папярэдне). Т.: 760-36-22.

### Bronx

**27** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер, dj Laurel.

**28** (пт), 22.00 — live music: «Atava».

**29** (сб), 23.00 — uplifting jazzy house: dj Top feat. Андрэй Ускоў (Apple Tea, гітара).

### Белая Вежа

**27** (чц), 22.00. White tower. 22.00. dj Top, dj Grizzly.

### Graffiti Club

**27** (чц) канцэрт Анжэлы Худзік, гітара — Аляксандар Саліенка. Пачатак а 20-й. Даведкі: 758-40-54. Замова месцаў: 693-74-16, 280-01-54.

### Madison Club

**28** (пт), 22.00 — live show: Мумій Троль. Кінатур «Выкрадальнікі кніг».

### X-Ray

**28** (пт), 22.00 — Tokyo calling AntonZap (Propaganda, Moscow), dj Noche. Singapore video background. Sushi for first time.

**29** (сб), 22.00 — dj Noche.

### Ямайка

**28** (пт), 21.00 — pre/arter party; 21.00 — 24.00 — dj Даша Пушкіна; 3.00 – XXX — dj АнтонZAP (Масква), dj Noche.

**29** (сб), 3.00 — afrter party; 3.00 — XXX — dj Top, dj Dasha Pushkina.

### Гудвін

**28** (пт), 21.00 — жывая музыка: група «Мадэра Хард Блюз».

## Тэатры

### Тэатар імя Янкі Купалы, Малая сцэна

**5** (сб) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».

**9** (ср) — прэм'ера спэктаклю «Эрык XIV» паводле Аўгуста Стрындбэрга. А.Стрындбэрг апісвае ў сваім творы рэальныя падзеі. Кароль Эрык XIV зрабіўся валадаром Швэцыі ў XVI ст. Ён закахаўся ў звычайную дзяўчыну, дачку вайскоўца-ахоўніка, якую кароль выпадкова сустрэў у адным з шынкоў Стакгольму... Рэжысэр-пастаноўшчык — народны артыст Беларусі Валеры Раеўскі, мастак — народны мастак Беларусі Барыс Герлаван, кампазытар — Віктар Капыцька.

### Опэра

**29** (сб) — гала-канцэрт салістаў.

**3** (чц) — «Трубадур».

**5** (сб) — «Чыё-Чыё-Сан».

**6** (ндз) — «Іялянта».

### Балет

**28** (пт) — «Рамэа і Джульета».

**30** (ндз) — «Лебядзінае возера».

**1** (аўт) — «Стварэньне сьвету».

**2** (сер) — «Карсар».

**4** (пт) — «Сьпячая красуня».

### Музычны тэатар

**30** (ндз) — «Кажан».

### Касьцёл Сьв.Роха

**7** (пн) — канцэрт арганнай і фартэпіяннай музыкі ў выкананьні Ігара Алоўнікава.

**8** (аўт) — канцэрт Сяргея Драбышэўскага (Санкт-Пецярбург) «Па старонках сусьветнай вакальнай клясыкі».

## Рэпэртуар менскіх кінатэатраў з 28 да 30 траўня

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Троя»: **28** (пт) 14.00 (іл), 17.00, 20.00; **29, 30** (сб, ндз) 14.00 , 17.00, 20.00.

«Каханьне паводле правілаў... і без» («Оскар-2004»): **28—30** (пт—ндз) 16.30, 18.50, 21.00.

**«Берасьце»** (272-87-91)

«Мільён год да нашай эры»: **28** (пт) 17.00, 21.00; **29, 30** (сб, ндз) 13.00 (іл), 17.00, 21.00.

«Егер»: **28—30** (пт—ндз) 15.00, 19.00.

**«Кастрычнік»** (302-93-25)

«Троя»: **28** (пт) 14.40, 17.50, 21.00; **29, 30** (сб, ндз) 14.40 (іл), 17.50, 21.00.

**«Масква»** (293-27-10)

«Троя»: **28** (пт) 18.00, 21.00; **29, 30** (сб, ндз) 12.00 (іл), 15.00, 18.00, 21.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«Барвовыя рэкі-2: Анёлы апакаліпсысу» ****: **28—30** (сб—ндз) 17.00, 21.00.

«Нават ня думай-2: Цень незалежнасьці»: **28** (пт) 19.00; **29, 30** (сб, ндз) 15.00 (іл), 19.00.

**«Перамога»** (293-77-66)

«Неслужбовае заданьне»: **28** (пт) 16.50.

«50 першых пацалункаў»: **28** (пт) 19.00, 21.10; **29, 30** (сб, ндз) 14.40 (іл), 16.50, 19.00, 21.10.

**«Піянер»** (297-64-87)

«Монстар»**** («Оскар-2004»): **28—30** (пт—ндз) 17.00, 21.00.

«Цяжкасьці перакладу» («Оскар-2004»): **28** (пт) 15.00, 19.00; **29, 30** (сб, ндз) 15.15, 19.00.

**«Цэнтральны»** (297-34-30)

«А вось і Полі»: **28** (пт) 13.00, 17.00, 21.00; **29, 30** (сб, ндз) 13.00 (іл), 17.00, 21.00.

«Выкрадальнікі кніг» (прэм'ера): **28—30** (пт—ндз) 11.00, 15.00, 19.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)

Рэйтынгавыя абмежаваньні:

*** — дзеці да 30 год не дапускаюцца;

**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**

«Зоркавыя сёстры»: **28—30** (сб, ндз) 14.30.

**«Берасьце»**

«Таямніца Заборскага віру»: **29, 30** (сб, ндз) 11.30.

**«Мір»**

«Карпарацыя монстраў»: **29, 30** (сб, ндз) 13.00.

**«Перамога»**

«Кевін у краіне Драконаў»: **28** (пт) 15.00; **29, 30** (сб, ндз) 13.00.

**«Піянер»**

«Тарзан»: **28** (пт) 12.00.

«Навагодні паштальён»: **28** (пт) 13.30; **29, 30** (сб, ндз) 12.00.

«Спартак і Калашнікаў»: **29, 30** (сб, ндз) 13.30.

**Паласу падрыхтавалі Наста Бакшанская, Сяргей Будкін, Сяргей Петрыкевіч**

МЕНСКАЯ КІНАПРЭМ'ЕРА

# Філейныя часткі Ахіла

Гісторыю асады й падзеньня Троі пераказваць чытачам ня мае сэнсу — усе і так ведаюць гамэраўскі эпас. І хаця сьляпы аэд мог бы прад'яўляць прэтэнзіі за амаль што атэістычную экранізацыю «Іліяды», у сучаснага кіно свае багі і свае правілы.

Стваральнікі карціны пазбавілі старажытных багоў усялякай улады — матывацыі эпічных герояў цалкам чалавечыя і «разжаваныя» сярэдняму гледачу. Агамэмнан (Браян Кокс) — падступны і жорсткі кіраўнік, які марыць пра абсалютную ўладу. Парыс (у выкананьні былога эльфа Арланда Блума) — інфантыльны й закаханы юнак-баязьлівец, Гектар (Эрык Бана) — годны воін і патрыёт сваёй зямлі.

Але, нягледзячы на гістарычныя шаты, часам зьяўляецца няўцямнае адчуваньне, што глядзіш «сацрэалістычны» фільм пра «Выратаваньне жаўнера Раяна», дзе пэрсанажы сышлі з плякатаў пра амэрыканскую армію — і нат крыху саступаюць ім ва ўпэўненасьці. Сцэны боек, пастаўленыя Вольфгангам Пэтэрсанам, які праславіўся казкай «Бясконцая гісторыя», значна цікавейшыя за карэктны дыдактызм дыялёгаў.

Самым вялікім праколам карціны — і самай вялікай прынадай — зьяўляецца Брэд Піт, філейныя часткі якога дэманструюць гледачам Ахіла, найлепшага героя Траянскай вайны. Брэд Піт сарамліва прызнаўся, што чырванеў, калі яму прыходзілася здымацца аголеным, а саромецца яму прыходзілася неадойчы.

Актор спраўна выканаў ролю расьпешчанага плэйбоя, надзвычай заклапочанага славаю,



**Троя** (Troy)
ЗША, 2004, каляровы, 163 хв.
**Жанр:** Гістарычны эпас (пэплюм)
**Адзнака:** 5 (з 10)

але роля эпічнага пэрсанажа яўна завялікая для славутай зоркі. Жах, павага і трымценьне герояў карціны, калі пабач зьяўляецца «антычны гігант» Брэд Піт, можна растлумачыць толькі тым, што пэрсанажы перад бітваю наглядзеліся галівудзкіх фільмаў.

У сучасных багоў і багіняў свае правілы — і свой эпас.

**Андрэй Расінскі**

Рыгор Барадулін

**Працяг. Пачатак у «НН» за 2003 год і ў №8, 10 за 2004**

# З запазухі

## Толькі

Адны спартоўцы ды яшчэ вайскоўцы могуць выступаць за розныя краіны.

Паэт — толькі за сваю зямлю, за сваю радзіму. Праўда, у наш збаўтаны час нарасьлі дзеці капітана гранта (грантасмокі), нават прафэсійныя беларусы. Паэты — болей рэліктавыя цені. Нездарма ж аднойчы Васіль Быкаў сумна ўсьміхнуўся: «Цяпер Саюз пісьменьнікаў значыць меней, чымся Саюз рыбаловаў».

## Будучая карова

Вушацкая аўтастанцыя. На сьцяне аб'ява: «Прадаецца будучая карова, падцёлка. Цяліцца будзе ў студзені месяцы».

А пасажырская гурма ні мычыць, ні целіцца.

## Эстафэта пакаленьняў

Куляючы чарку за чаркаю, дзядзька раіў пляменьніку:

— Ніколі не запівай — беражы карысную плошчу…

Гэта каб пад канец застольля не шкадаваць, што выпіў болей, чым мог, але меней, чым хацеў.

Прафэсіяналы звычайна пра чарку кажуць замілавана: першая калом, другая сакалом, а трэцяя дробнай птушачкай.

Эстафэта пакаленьняў пітакоў непарыўная.

Камуністы, як ні біліся, непарыўнасьці такой не дабіліся.

## Кароўі імі

Мама ўспамінае нашу карову з хутару Верасовачка: «У яе чайчка на лбе…», пасьля:

— Кароўі імі запісавай: Туроля, Белахвостка, Букетка, Зьвязднэя й Зорка, Падласка (пад жыватом бела), Лысоня, Белахрыбтка, Касмыль, Быстроня, Памаўза (памаўзьлівая), Гілёня (чырвоная была), Гарбалыска, Лісіца, Салавей.

Колеры, гукі, замілаваньне й трапнасьць грэюць душу. Тут і паўдзён, і гіз, і туман сырадою, і сьнег малозіва. Чуваць мамін прыгавор: «Чалавек відаць летам без кароўкі, зімой — без кажушка».

А мама мне:

— Во яшчэ імі вёсак нашых: Пальчыкі, Памялковы, Бугаі, Сітнікі, Ідата, Бычкі, Ляжні, Гарбаціца, Пожанькі, Паліцаі, Ціханяты, Двор Жары, Ваўчо, Занавіньне, Кручча, Лажані, Вяркуды, Вугрынкі, Гасбэрак, Крошына, Антунова, Вярхоўя, Рубанікі, Задаброцьце, Зазер'я, Занавіньне, Мосара, Завячэльля, Юркоўшчына, Глыбачка, Пісаронкі, Увалокі, Туроўля, Адворня, Паперня, Янова, Курылёнкі, Цьвеціна.

Зямныя сузор'і крывіцкіх абсягаў, прапамяці. Якая спадчына лучыць душу зь вячнінаю…

## Як увосень пагояў

Рэдка езьдзіў да мамы. Гаротніца й казала:

— Матка цябе бачыць, як увосень пагояў. Сонца выясьніцца, і зноў воблакі…

Цяпер думкі мае толькі там, толькі каля мамы. Але позна.

## Як у печ…

Бабка вырашыла зьвярнуцца да гінэколяга. Чарга прайшла. Яна адна засталася. Сядзіць. Нарэшце асьмялела. Зайшла ў кабінэт.

Гінэколяг маленькі — табурэтачка трэба, калі кліенткі нармальнага росту.

Бабка вохкае:

— Чаму ж ты трактарыстам ня стаў, ці табе трактара не хапіла?

Усё кажа й кажа нешта, абы час цягнуць.

Гінэколяг супакойвае:

— Не хвалюйся, бабка, я туды гляджу, як ты ў печ…

Галоўнае ў лекарскай практыцы — суцешыць…

## Ня я страляў…

Савецкая ўлада як пачалася з барацьбы, дык і яшчэ дагэтуль змагаецца там, як яе да каранёў ня выкарчавалі.

Барацьба з Богам. Барацьба з нармальнымі людзьмі, у якіх былі галовы на плячох.

Потым барацьба з прыродаю. Беламорканал. Цаліна. Асушэньне балотаў і, пад канец, БАМ (Байкала-Амурская магістраль). Адразу ж папеўка вырасла:

Приезжай ко мне на БАМ,
Я тебе на рельсах дам.
Пока не ходят поезда,
Пускай работает ...

Прыяжджае на БАМ карэспандэнт з гнілога Захаду. Пытаецца:

— Вы хто?

— Камсамольцы.

— А з аўтаматам хто?

— Гэта наш камсорг.

— А колькі табе гадоў? — цікавіцца ў рослага будаўніка.

— Пятнаццаць.

— А я б болей даў.

— А ты, сука, кінь, болей па кодэксе не даюць.

Мне распавядаў і наш браток-беларус. (Памятаеце ў Якуба Коласа: «Куды ня трапяць беларусы!») Добраахвотнікам паехаў цягнуць магістраль.

Стурылі мядзьведзя. Перабаразьнілі яму сон зімовы. Мядзьведзь і папёр на камсамольцаў. Пачалі страляць. Мядзьведзя стрэлы не спынілі. Усе наўцёкі. Мядзьведзь за імі. Першы спатыкнуўся. На яго пачалі валіцца. А бедалага думае, што на яго мядзьведзь насеў, апраўдваецца перад разбуджаным, крычыць:

— Гэта ня я страляў!..

## Ты чалавек ці міліцыянэр?

Змалку чуў ад вушацкіх гэтае пытаньне да чалавека, які вызначаўся нахрапістасьцю, не трымаў свайго слова, глядзеў, каб што ўрваць.

Ужо добра дарослым пераканаўся ў грунтоўнасьці запытаньня гэтага.

Працую ў часопісе «Бярозка», які рэдагуе звышідэйны, звышпартыйны паэт Кірэенка. Падышоў адпачынак. Атрымаў адпускныя. Купіў сьветлы гарнітурчык. Еду ў Вушачу да мамы. Зазірнуў да дзяўчыны Ліві. Па дарозе на кватэру — рэстаран «Лета». І на дварэ лета. Цёплае. Маладое. Заходжу ў «Лета». Сядаю за столік. Заказваю грамаў трыста. Рэстаран пусты. Непадалёку ад мяне самотны й цьвярозы міліцыянт. Шкада зрабілася чамусьці самотніка. Запрасіў за свой столік. Адпаведна наліваў і яму, і сабе.

Прачнуўся ў працьвярэзьніку (першы й апошні раз). Рукаў у новым пінжаку адарваны. Грошай ні капейкі. Ды яшчэ пайшоў пахвальны ліст у рукі звышкамуніста.

І няма яго, у каго мусіў спытацца: ты чалавек ці міліцыянэр?

Дасюль шкадую. Вачыма шукаю й не знаходжу. Зашмат падобных…

## Пры старым…

Бабка, узгадваючы часіны маладосьці, падкрэсьлівала:

— Было гэта пры старым прыжыме…

І казённае, мулкае слова «рэжым» набывала лірычнае адценьне. Амаль канкрэтна грэла бабку.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

## Праклёны

Цыганка ходзіць і прапануе паваражыць, усё схаванае лёсам паварушыць. Заадно просіць пазалаціць руку, даць нешта ёй і цыганяткам ейным.

Маладзіца адвярнулася ад варажбіткі ды штосьці буркнула. Цыганка адразу:

— Каб цябе стары вялым любаў!

Мужчына пачаў усьміхацца, але ў кішэню не палез. Яму таксама рэцэпт суровы:

— Я зраблю, што ў цябе ня толькі стаяць ня стане, ня будзе, але й вісець будзе ня так…

## Веснакрылы

Човен. Сама таемнасьць затаілася ў слове. Тут і чарот шэпча, й вір завінаецца. Тут і вецер і венцер. Чорны вецер і чуйнае дасьвецьце. Чало й вечнасьць. Ветах і вехаць. Чабор і верас. Човен роздумны. Човер чулы, човен парыўны.

Якія толькі воды ні ксьцілі яго, а човен так і застаўся паганцам. Склаўшы далоні, прасмоленыя смалой неразгаданасьці, моліцца човен богу рызыкі, богу неспакою, богу несупыннай вечнаплыннасьці часінаў.

Човен — калыска. Калыша клопат. Калыша дапытнасьць. Люляе мрою.

Човен — бясколы воз. Сонца вязе набожна, зоры баіцца растрэсьці. З паклажай зямной і нябеснай сыпяшаецца. Каб не спазьніцца, папросіцца аблачынка — і яе падвязе. Калі й не па дарозе.

Човен — дамавіна. Гэта Харонаў човен перавозіць душы людзкія зь берагу бытаваньня часовага на бераг вечны. Думаецца, што ўсіхняя.

У чоўне, што змову мае з чаротам, з асітою ды мячэўнікам, паміpae сіла, якая човен пусьціла ў сьвет вады й неба.

Човен — чаўнок. Тчэ каляныя абрусы раніцы, цёплае сукно паўдзёну, зябкі шарачок шарэньніка.

Човен — каўчэг. Гэта той човен, які ўратаваў семяну ўсяго жывога. Каб зямля не была самотная.

Човен — птах. І аднакрылы. І двухкрылы. Веслакрылы. Веснакрылы. А ў неба ніяк не ўзьляцьць. Але ж ад зямлі адарваўся.

## Не купіла б…

Калі вушацкія купляюць парасё, перш за ўсё пытаюцца, а ці ешчае. Гэта значыць, ці добра есьць, ці непераборлівае.

Мама некалі, гледзячы, як маладая нявестка есьць, казала:

— Калі б ты была парасяткам, я б цябе не купіла.

І былі мы з Васілём Быкавым у Вушачы, як ужо не было мамы маёй. Прыйшлі на сьнеданьне да Марушкі. Яна засмажыла па-вушацку яечню ў калена. Напякла стог бліноў. Я пачаў старацца, а Васіль папоркаўся відэльцам, пасмакаваў блінок і падзякаваў. Потым Марушка мне казала:

— Добры чалавек Быкаў, толькі няешчы...

## На Макавея

Марушка тлумачыла мне сэнс сьвята. Макавей чысьлавы. Што на Макавея робяць? Пост робяць, пахлёбку з буракоў. Жыта ў цэркві сьвенцюць, буракі, мёд. Як зажынаюць, жменьку за ікону паторкнуць, а тады на Макавея абатрусць рукой і ў цэркві сьвенцюць. А тады, як сеюць, на пачатак загону жытцо сьвянцонае, каб расло.

## Блаславеньне

Мама вучыла: калі ўвосень убачыш у небе жураўлёў, якія кіруюцца ў вырай, трэба ўсьлед ім зычыць:

— Пуцём-дарожкай, пуцём-дарожкай!

Каб клін ня зблытаўся, каб з дарогі ня зьбіліся.

## У нашых душах Вільня.

Вольна ўздыхнула вечнасьць, зірнуўшы на ранішнюю веліч характва, якое ацаліла яна, пакінула характво, каб грэць сваю халадкаватую душу.

Вятры — пастухі зброддівых часінаў пасьнедалі ўсьмешкаю, выдыхнуўшы віракружнае найменьне — Вільня.

Вільня — гэта вышыня аратайнай, ваярскай і дойліднай моцы, якая панавіта запрасіла жывыя камяні на момант застыгнуць і задумацца, ці яны вырасьлі зь зямлі, ці прыляцелі, як адпалыя зоркі.

Вільня — гэта глыбіня крывіцкага духу прадоннага, як неба, неспасьціжнага, як само жыцьцё.

Вільня — гэта вільчак аблачыстай страхі, дзе віюць гнёзды свае ластаўкі вёснаў, што прылятаюць, каб маладзіць і знайдзейваць даўніну, шчабятаць па-ўнучынаму дзядулю Космасу пра забытае.

Некалі Напалеон, пабачыўшы касьцёл сьвятое Ганны, ашаломлена сказаў: «Каб мог, панёс бы яго на сваёй далоні ў Парыж...»

Кожны крывіч, кожны беларус носіць Вільню ў сваёй душы. А ўсё, што жыве ў душы, не разбурыецца, не руйнуецца, яно непадлеглае нават бязьлітаснаму часу.

...Некалі гасьцяваў я ў Геворга Эміна, аднаго з самых любімых паэтаў Арменіі. З акна ягонага ўтульнага жытла добра відаць Арарат — сьвятарная гара армянскага народу. Як жывы. Здаецца, можна прыпасьці да падножжа, адчуць вольніцу вятроў і халадэчу сьнягоў. А вандзіцца толькі позіркам кунежыць вяршыню чыстую й высакачолую...

І так каторае ўжо засмучанае пакаленьне мілуе вачыма Арарат, жывіць душу напамінам і сподзевам...

А мне адразу ўсплыла Вільня — пупавіна нашае самаснасьці, калыска беларускай дзяржаўнасьці, радзіма беларускага друкаванага слова, тая гара, якая высіць нас у Эўропе.

Вільню чуе наш слых, Вільню бачыць наш успамін. Вільняй б'еццa крывіцкае сэрца.

Для любові няма дзяржаўных межаў. Вільню ў нас ніхто ня змог забраць, ніхто ня здолеў адлучыць нас ад Вільні, бо яна жыве ў нас.

І літоўцы прызналі нашую Вільню за сваю. Бо ад дабра дабра не шукаюць. Усьцешна, што літоўцы ганарацца нашай Вільняй, называючы яе сваёй, мянуючы яе Вільнюсам. Вільні на ўсіх хопіць!

Любоўю й пакаленьнем трываляцца сьвятыя месты ў вячніне.

І пакуль стаяцьме Вільня, у беларусаў будзе што ўспамінаць, будзе па чым сумаваць. Будзе жыць сподзеў!

Сьвятлана Сьмірнова

# Купідон



**Сьвятлана Сьмірнова** — пісьменьніца, жыве ў Менску. Яе «Купідон» заняў першае месца на конкурсе апавяданьняў, што ладзіў часопіс «Cosmopolitan».

«Усё добра!» — гучна паведаміла я сьценам сваёй кватэры. Сьцены звыкла змаўчалі. Цішыню летняй ночы парушалі толькі шум машын за акном ды ціканьне гадзіньніка на паліцы. Апошні застаўся мне ад прабабулі. Гадзіньнік быў груваcткі й аляпаваты: невялічкі цыфэрблят атачалі медныя вежачкі ды купалы, абвітыя пышнай расьліннасьцю, шпілі вежаў вянчалі таксама медныя сэрцайкі, стужачкі, банцікі, а на вяршыні канструкцыі сядзеў тоўсьценькі Амурчык, які нацягваў цеціву свайго знакамітага лука. Немудрагелісты гадзіньнік, тым ня менш, спраўна паказваў час і ніколі на маёй памяці не патрабаваў рамонту. «І на гэтым дзякуй», — падумала я і стала ўладкоўвацца спаць. Толькі сон усё ня йшоў. Вострае пачуцьцё адзіноты, якое апошнія месяцы апаноўвала мяне, настойліва стукала ў сэрца, замінаючы заснуць. «Рабіць няма чаго — неабходна закахацца, — загадала я сама сабе, — узаемнае каханьне ідзе на карысьць фізычнаму, а калі пашанцуе, то й маральнаму здароўю». Прыняўшы рашэньне, я, па сваёй нядаўна набытай звычцы, вымавіла яго ўголас і нарэшце спакойна заснула.

Нехта сьвістаў. Гэты сьвіст будзіў мяне, выцягваючы са сьвету сну. Нарэшце я скарылася гуку і расплюшчыла вочы. Раніца толькі пачыналася. За два мэтры ад мяне, на паліраванай паверхні пісьмовага стала, гайдаючы моцнымі ножкамі ў серабрыстых сандалях, сядзела залатавалосая ЖЫВАЯ істота ростам у дзьве чалавечыя далоні, апранутая ў белую туніку. Яна насьвіствала мэлёдыю.

— А-а-а! — залямантавала я.

«Ціха», — скрывілася істота. Потым паднялася на ногі, з годнасьцю пакланілася і назвалася: «Купідон». Не дачакаўшыся ад мяне рэплікі ў адказ, яна ўздыхнула і, заклаўшы рукі за сьпіну, пачала павольна блукаць па веку стала. За сьпінай у істоты выявілася пара белых крыльцаў і тул з залатымі стрэламі, на плячы боўтаўся лук.

«Я звар'яцела, — з жахам падумала я. — Але ці ж можна вось так страціць розум за адну ноч?»

— Можна, — паведаміла істота. — Але я тут па іншым пытаньні. Табе ж спатрэбілася закахацца?!

— Мне? — уступіла ў дыялёг я.

Істота ўздыхнула і падняла вочы да неба, дакладней, да столі.

Вытрымаўшы паўзу, яна спытала:

— Малако ёсьць?

Малака не было. Але я, здаецца, пачала здагадвацца: «Купідон?.. Амур! Бажок каханьня. Ён!.. Ён, з прабабчынага гадзіньніка».

— Падымайся — мы ідзём па малако. Гэта першае. Другое — не Амур і не бажок, я — Купідон. Табе ж зразумела сказалі. Трэцяе — я не з гадзіньніка, я зь нябёсаў.

Ён казаў суха і адрывіста, як гавораць пакрыўджаныя людзі.

— Ты чытаеш мае думкі? — запозьнена зразумела я.

— Я ня ўмею чытаць і думкі проста чую, — адказаў ён. І кусьліва дадаў: — У Купідона на тваім гадзіньніку сапраўды праблемы зь лішняй вагой, а ў мяне іх няма.

Ён уцягнуў круглы жывоцік і кінуў на мяне пранікнёны погляд. Я пастаралася ўстрымацца ад камэнтароў у думках.

— Такім чынам, Купідоны сьнедаюць малаком і мы ідзём у краму? Выйдзеш? Мне трэба апрануцца.

Залатавалосы хлопчык пакладзіста распрастаў крылы і паляцеў да дзьвярэй:

— Толькі чаму ты кажаш у множным ліку? Купідон — я — адзін!

Ледзь ён зьнік, я паглядзела на гадзіньнік. Вежы, ружы, стужкі і астатні дэкор засталіся на месцы. Амурчыка на гадзіньніку не было.

* * *

Купідон прыдзірліва агледзеў прадметы, стоячы на маім кухонным стале. Потым папрасіў сурвэтку, нетаропка заслаў ёю масьлёнку і сеў зьверху. Крыху паёрзаў, устаў, падышоў да цукарніцы, ухапіўся дзьвюма рукамі за яе круглую ручку і з шумам пацягнуў за сабой, прысунуўшы ўсутыч да масьлёнкі. Падумаўшы, папрасіў у мяне яшчэ адну сурвэтку. Атрымалася крэсла, засланае белым, на якое мой госьць цырымонна ўсеўся і сказаў:



КАЛЯЖ АРЦЁМА ЛЯВЫ

— Можна падаваць.

Самы маленькі кубак, які толькі знайшоўся ў маім доме, здаваўся ў яго руках збанам. Купідон глынуў малака, кіўнуў і закінуў нагу за нагу:

— Вось ты пытаеш, у чым заключаецца тэхналёгія працэсу...

— Я пытаю? — не ўтрымалася я.

Ён толькі рукой махнуў, маўляў, не замінай:

— …Яна клясычная, без новаўвядзеньняў. Ты паказваеш мне мужчыну, зь якім зьбіраешся пачаць раман… Не падумай варыць каву! Яна ж жахліва пахне. Выпі лепш цёплага малака. Дык вось, паказваеш патрэбнага мужчыну і становішся насупраць яго, а я працінаю вас абаіх адной стралой. Хутка і не балюча. Далёка ён знаходзіцца? А то на дождж паказвае.

— Хто — ён? — не зразумела я пытаньня.

— Абраньнік, — цярпліва сказаў Купідон.

— Яго яшчэ зусім няма, але за гэтым затрымкі ня будзе.

— Думаеш? — засумнявалася баство. — Ну глядзі….

Дождж усё-такі пайшоў. Я раскрыла парасон, і нябесны хлопчык адразу ўзьляцеў пад яго купал.

— Скажы, калі ласка, каханьне, выклікане тваімі стрэламі, — яно назаўсёды?

— Яно надоўга.

— А што потым?

— Потым… потым. Потым падбяром табе новае каханьне. Трымай парасон раўней, на мяне трапляюць кроплі. Ці далёка яшчэ ляцець?

У мяне быў плян, і я падвяла свайго Купідона да стаянкі дарагіх аўтамабіляў. Выбрала самую, на мой ня надта спрактыкаваны погляд, шыкоўную машыну, агледзела яе гаспадара — маладога імпазантнага мужчыну з упэўненымі манерамі і засяроджана задуменным тварам, стала насупраць яго, распахнула абедзьвюма рукамі каўнер жакету і са сьмехам крыкнула залатавалосаму богу каханьня:

— Страляй!

На той момант я не ўспрымала сытуацыі сур'ёзна. Яна здавалася мне вясёлай гульнёй, чароўнай прыгодай. Пра тое, што я вырашаю свой лёс, зусім ня думалася.

Купідон ажывіўся. Звыклым жэстам дастаў стралу, нацягнуў цеціву. Я на ўсялякі выпадак заплюшчыла вочы і пасьпела падумаць: «Прынамсі, вазьму ў будучага бой-фрэнда грошай і аплачу рахункі за тэлефон ды за…» У той жа момант да мяне данёсься бесклапотны галасок маленькага бога:

— А няма ў яго аніякіх грошай.

— Стой! — закрычала я так, што спалохала сама сябе. — Стой, не страляй! Як няма?

Яшчэ падчас нашага паходу ў краму я зразумела, што ніхто ня бачыць і ня чуе Купідона, які ляціць побач са мной. Але на мае дзеяньні магічная заслона нябачнасьці не пашыралася. І цяпер мінакі няўхвальна аглядалі мяне з ног да галавы. Імпазантны мужчына, які не падазраваў, што сэкунду назад быў цудам выратаваны ад палкага каханьня, наадварот, пагледзеў зь цікавасьцю. Але я сьпешна ўцякла зь месца здарэньня і, перавёўшы дух, запатрабавала ад бога каханьня тлумачэньняў:

— Ты не пажартаваў? Ты нешта ведаеш пра гэтага чалавека?

— Я не празорлівы Купідон, я Купідон, які чуе думкі. Так, твой мужчына ішоў абедаць ва ўласны рэстаран, але пры гэтым ён увесь час паўтараў: няма грошай. І… Вось у гэтага ёсьць грошы!

Я паглядзела на паказаны ім аб'ект і жахнулася: малады, але ўжо лысаваты шчуплы мужчынка, апрануты ў сьмешныя штонікі і мятую кашулю, таропка пераходзіў вуліцу.

— Па-мойму, ён на галоднай дыеце.

— Ня ведаю пра дыету. А грошы ў яго ў пакеце ляжаць. Ён іх усё жыцьцё зьбірае і з сабой носіць.

— Навошта?

— Хоча напісаць і выдаць кнігу.

— Пра што?

— Пра сябе. Ён думае, што ён Напалеон.

— Ты мне ў такога прапаноўваеш закахацца?

— Ты сама пачала пра грошы. А калі важны выгляд, дык хадзем да тэлецэнтру: падбяром табе кінагероя.

— Мне не патрэбны прыгажун ці багацей. Мне патрэбны чалавек, якога я буду кахаць. Тады я змагу паважаць нават тыя ягоныя погляды, якія ня будуць супадаюць з маімі.

— Дык давай я выстралю ў каго-небудзь, і паважай сабе на здароўе!..

— Не патрэбен мне хто-небудзь. Патрэбна каханьне!

— А я табе пра што кажу?!

— Ты нічога не разумееш!!!

— Ты абяцала, што з выбарам праблем ня будзе!!!

Дома Купідон спляніраваў у фатэль, запатрабаваў малака і ўключыў футбол.

— Я думала, бог каханьня аддае перавагу лірычным песьням, — зьдзівілася я. У адказ ён агідліва скрывіўся.

— Слухай, а можа, мне наагул ня трэба кахаць, — з адчаем у голасе пачала я. — Ня так гэта проста — даверыць сваё сэрца незнаёмаму чалавеку, разумееш?

Залатавалосы прыгажун узьляцеў на сьпінку фатэля і дзелавіта прапанаваў:

— Давай тады паспрабуем пашукаць сярод знаёмых. Што скажаш пра свайго былога? Ён, вядома, крыху жорсткі, але…

— Крыху жорсткі? Ды ён проста гад! — непаважліва перабіла я нябеснага пасланца, звыкла страціўшы кантроль над эмоцыямі, ледзьве гаворка пайшла пра былога бой-фрэнда. — Ты ж ведаеш, што ён зрабіў!.. Не, хто хочаш, але толькі ня ён!

— Добра, — лагодна пагадзіўся Купідон. — А што скажаш пра цяперашніх сваіх паклоньнікаў?

— Пра каго менавіта? — ажывілася я.

За паўгадзіны мы перабралі ўсіх знаёмых мужчынаў, але так ні на кім і не спыніліся.

— Ты праз Інтэрнэт страляць можаш? — вырашыла не здавацца я.

— Магу, — адказаў бог каханьня, — але аддаю перавагу жывым мішэням.

Ён зьбіраўся вярнуцца да свайго футболу, але, заўважыўшы маё згаслае натхненьне, дадаў:

— Гэй, не сумуй! Калі што, дык я сам з табой ажанюся.

— А колькі табе гадоў?

— Некалькі тысяч.

— Пойдзе. І ты вольны?

Тут пачуўся званок у дзьверы. На парозе маёй кватэры стаяў той самы імпазантны хлопец-зух, безграшовы гаспадар прыгожай машыны і рэстарану.

— Добры вечар. Вы пакінулі свой парасон побач з маёй машынай.

— Добры вечар. Дзякуй. Але як вы мяне знайшлі?

— Я якраз думаў, як вас знайсьці, і раптам убачыў, што вы ўваходзіце ў дзясяты пад'езд. У гэтым доме жыве мая мама.

— Якое цікавае супадзеньне.

— Супадзеньняў не бывае. Вы так ня лічыце?

Ён паглядзеў на мяне вачыма колеру сьпелай вішні, і я адчула, што гатовая зь ім пагадзіцца.

— Праходзьце, калі ласка. Вып'еце гарбаты?

— З задавальненьнем. У вас прыгожа — паўсюль яркія фарбы. Памятаеце, як у Борхеса? — і ён працытваў радкі з эсэ, якое я цяпер чытала…

Першыя паўтары гадзіны нашай гутаркі праляцелі непрыкметна. Мы размаўлялі як людзі, што знайшлі ў далёкім горадзе чужой краіны кагосьці, з кім можна пагутарыць на роднай мове, мове дзяцінства, сэрца і эмоцый. І кожны паварот нашай гутаркі адкрываў усё новыя і новыя грані. Нічога дзіўнага, што, захапіўшыся, я не заўважыла, як у пакой заляцеў Купідон. Залатавалосы хлопчык быў дзелавіты і сур'ёзны. Але гэтым разам ён дзейнічаў упэўнена, не пытаючы дазволу. І, магчыма, я пасьпела б крыкнуць богу каханьня «Не страляй!», але мне не хацелася. Наадварот, я лічыла, што ў ягонай страле ўжо няма патрэбы. Таму што мне раптам болей за ўсё на сьвеце захацелася падзяліць жыцьцё з мужчынам, якога завуць Алег, мужчынам, што сядзеў насупраць. Я ВЫБРАЛА ЯГО. Купідон меў рацыю — гэта не балюча. Але ўсё-такі, калі страла ўваходзіць у сэрца, яно замірае, а потым б'ецца хутчэй, і робіцца цяжэй дыхаць. Алег адчуў тое самае. Ён на імгненьне заплюшчыў вочы, а потым працягнуў:

— …І на новы будынак музэю ў іх няма грошай. Усе страцілі надзею. Я якраз думаў пра гэта, і раптам убачыў цябе. Такую прыгожую, апантаную, зь вясёлым бляскам у вачох…

Купідон паслаў мне паветраны пацалунак, цырымонна пакланіўся, падляцеў да столі і зьнік. Я ведаю, што буду сумаваць па ім. І яшчэ я ведаю, што на прабабчыным гадзіньніку сярод медных вежачак, ружачак і стужачак болей ня будзе пульхненькага Амурчыка.

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Беларускі гатэль «Лямбэрт»



**Субкультура маладых беларускіх эмігрантаў у Чэхіі — адзін з самых цікавых фэномэнаў сучаснасьці. Калі нехта верыць, што адрадзіць вясёлы дух вясны 96-га можна шляхам штучнага апладненьня, раю зьбіраць банк спэрмы там.**

У Карчынскага ёсьць анэкдот пра дзьве магчымыя мадэлі дыяспары: калі на чужыне сустракаюцца два сьвядомыя армяніны, яны абкладваюць рэкетам суседні «камок», калі ўкраінцы — ад настальгічнай нудоты выдаюць «Кабзара». Маладая беларуская алія ў Чэхіі стварыла новую мадэль эміграцыі.

Неяк, будучы ў Лёндане, заехаў да айца Надсана, які, каб уразіць мяне нечым большым, чым куранты Біг-Бэна і брытанскія цэны, прадэманстраваў арыгінал скарынаўскай Бібліі. На мінулым тыдні Ю.В., беларускі палітупырхлік у Празе, з той жа мэтай уразіць, прывёў мяне ў самую брудную «ідэльню» ў горадзе і замовіў сапраўдны самагонкі з Маравіі. Самагон быў вязкі і смачны.

Субкультура маладых беларускіх эмігрантаў у Чэхіі — гэта адзін з самых цікавых фэномэнаў сучаснай беларускай культуры, які, на маю думку, трэба ўнесьці ў сьпіс помнікаў культуры ЮНЭСКА разам з праспэктам Скарыны і Нясьвіскім замкам. Сябры Партыі аматараў піва і анархісты, якія на зломе стагодзьдзяў абралі Чэхію і Маравію ў якасьці прыстанішча ад маразмаў лукашызму, стварылі арыгінальную мадэль дыяспары. Не крымінал і не нуда па Радзіме (натуральна, месцамі ёсьць і гэта) вызначаюць яе экзыстэнцыйныя каштоўнасьці, а нейкі геданізм. «З усіх удзельнікаў пасяджэньня беларускай групы толькі М.С. не атрымаў пасады». — «Чаму?» — «Дык ён прыйшоў на сустрэчу ўпыханы. Мы і так усе былі вясёлыя, а ён — поўныя дровы» (з размовы двух эмігрантаў).

Палітэканомія новай дыяспары пабудавана на спэцыфіцы яе працы. Дзякуючы аднаму зь піянэраў-эмігрантаў беларусы здолелі захапіць такі сэктар працы, як абслугоўваньне турыстаў у цэнтры гораду, на невялікім трохкутніку паміж Карлавым мостам, Старамескім пляцам і Мустэкам. Сёньня амаль кожны эмігрант дзякуючы элемэнтарнай карупцыі можа атрымаць тут джоб. Відавочна, што, працуючы побач ды без асаблівага фанатызму, маладыя ўпырхлікі маюць магчымасьць для кантактаў, агульных праектаў і, натуральна, час для расслабону. Гэта дае адзіныя вынікі.

Толькі такая этычная формула выконвае гістарычную місію дыяспары — забясьпечвае ідэйны лінк паміж эканамічнай і палітычнай часткай беларускіх эмігрантаў. Прастора, дзе сустракаюцца індыфэрэнтныя да вялікай палітыкі рабацягі і былыя «адмарозкі», — не царква і ня «круглыя сталы» радыё «Свабода», а старамакаўскія піўныя «Каравэла» і «Ў Бабушкі». На сустрэчы ў беларускім цэнтры мне адрэкамэндавалі сучаснага беларускага актывіста — былога мянта.

Ня ведаю, ці стане Старамак беларускім гатэлем «Лямбэрт» (палітычны штаб польскай апазыцыі ў экзылі XIX стагодзьдзя), але, калі нехта верыць, што адрадзіць вясёлы дух вясны 96-га году можна шляхам штучнага апладненьня, раю зьбіраць банк спэрмы там.

**Лёлік Ушкін**

ВАКАНСІІ

## «Наша Ніва» запрашае

спэцыяліста па абслугоўваньні кампутарнай сеткі на трацціну стаўкі. Пажаданыя рэкамэндацыі.

**Зьвесткі пра сябе дасылаць на адрас nn@promedia.by**

## Запрашаем мастака

для працы над кніжнымі і рэклямнымі праектамі. Акрамя выдатных прафэсійных якасьцяў пажадана павага да Сьвятога Пісаньня.

**Т.: 69-69-501. Віктар**

## Незалежны культурны часопіс «ARCHE»

шукае на пастаянную працу дызайнэра-афарміцеля вокладак.

Патрабаваньні да кандыдатаў:

— мастацкая адукацыя;

— дасканалае валоданьне праграмамі «Adobe Photoshop» і «Coreldraw»;

— крэатыўнасьць;

— беларускамоўнасьць.

Наяўнасьць рэкамэндацыяў вітаецца.

**Просьба дасылаць рэзюмэ на адрас arche@arche.org.by з пазнакай у полі тэма «конкурс».**

ШТУРМ FM — 2

## «Вока» і «BMA-group» пачынаюць новую кампанію

Больш за год ужо на нашых радыёстанцыях можна пачуць 50% беларускай музыкі. У гэтым, зразумела, нічога дрэннага няма! Але што ж мы бачым пасьля таго, як мінуў год? Як круцілі Б.Майсеева, Ю.Антонава, гурт «Краскі», «Бі-2», А.Сьвірыдаву і г.д., так і цяпер іх можна пачуць, але ўжо пад іншым лэйблам («Слухай сваё!»). Якія ж гэта беларускія выканаўцы? І яшчэ: расейскамоўны сьпеў ці можна назваць беларускай музыкай?!

Таму моладзевая ініцыятыва «ВОКА» і «BMA-group» распачалі кампанію «Штурм FM», асноўнай мэтай якой зьяўляецца павелічэньне колькасьці беларускамоўных кампазыцый у этэры радыёстанцый.

Як гэта будзе адбывацца:

1) вы рэгіструецеся;

2) за тыдзень да пачатку кампаніі Вам прыходзіць раскладка, якую радыёстанцыю і ў які дзень мы «штурмуем» (там будзе ўказаны час выхаду ў этэр);

3) Вы тэлефануеце ў этэр і замаўляеце беларускамоўныя песьні.

Заўвага: віншуючы сяброў, пажадана, каб Вы ў этэры размаўлялі па-беларуску. Але ж на якой мове гаварыць — гэта ваш выбар.

• ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ •

### ВІТАНЬНІ

**Зьмітра Веліча** віншуем з Днём народзінаў! Зычым шчасьця, здароўя і моцнай веры! Мы ім яшчэ пакажам кузькаву маць! Сябры

**З Днём народзінаў**, старшыня! Мы цябе любім і паважаем, Сяржук! Берасьцейскі МФ

**Сяржук**, цярпеньня табе! Плён абавязкова прыйдзе! «Зараз у сэрцы сваім вольны наш сьцяг уздымі!» Наталька

**Сяржук Бахун**, мы верым у цябе! У цябе ўсё ўдасца! Жыве Беларусь!

### КАНТАКТЫ

**Літкварталаўцы** Шніпа-Рублеўскай! Запрашаю 27 траўня а 18.30 у «Беларускую хатку» на вечарыну «Фотаальбому». Нераток

**Набіраю** каманду для выданьня на беларускай лацінцы. Аляксей. Т.: 244-55-95

**Пазнаёмлюся** зь беларускім хлопцам. Валянціна. Т.: 259-97-80

### КНІГІ

**Набуду** 2-і том збору твораў У.Караткевіча ці абмяняю на яго 4-ы том збору твораў К.Чорнага. Т.: 238-29-51

### ПРАЦА

**Нямецкая**, ангельская, польская мовы: якасныя пераклады. Т.: 240-78-01, 775-69-02. Электронны адрас: vitalstan@mail.by. Віталь

### СПАЧУВАНЬНІ

**Выказваю** шчырае спачуваньне Андрусю Мельнікаву з нагоды сьмерці маці. Генадзь

### СТУДЭНЦКІ БІЛЕТ

**Згублены студэнцкі білет** №026165 на імя Фамішкіна А. лічыць несапраўдным

БЛІЗКАЯ ГІСТОРЫЯ

# Чужы сярод сваіх



**КОНКУРС ДЛЯ ШКОЛЬНІКАЎ**

**Пераможцаў чакаюць прызы!**

ГА «Дыярыюш» пры ўдзеле Таварыства беларускай мовы абвяшчае конкурс «Чужы сярод сваіх».

У конкурсе могуць браць удзел вучні сярэдніх навучальных установаў (з 7-й клясы), а таксама навучэнцы каледжаў, ПТВ, тэхнікумаў (да 19 год).

Форма працы адвольная: сачыненьне, інтэрвію, фільм і інш. Да нятэкставай працы (аўдыё-, відэа-, фатаздымкі) павінна быць далучана пісьмовая частка: адлюстраваньне працэсу дасьледаваньня альбо камэнтар да крыніц.

Працу пажадана пісаць па-беларуску.

Да працы мае быць далучана анкета ўдзельніка зь яго прозьвішчам, імем, каардынатамі і назвай працы.

Працу трэба дасылаць у адным асобніку да 25 лістапада 2004 г. (дата вызначаецца паводле паштовага штэмпеля) на адрас: «Блізкая гісторыя», а/с 128, 220064, Менск.

Вынікі будуць абвешчаны **25 сакавіка 2005 г.**

Інфармацыю, парады і брашуру, у якой падрабязна выкладзены ўмовы, можна атрымаць ад сакратаркі конкурсу Ірыны Коваль (т.: (8-017) 223-61-42, 8-029-613-60-87, e-mail: historyja@belinter.net).

Зычым посьпехаў!

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Гэніку Л. зь Менску.** Мы прасілі пра гутарку з гэтым палітыкам, але ён не знайшоў часу, на жаль.

**А. з Ж-на.** Трыкалёр — значыць трохколерны. Называць наш нацыянальны штандар трыкалёрам нясьлушна.

**К.Т.** «Занатоўкі аўтсайдэра» завялікія для газэты. Цікавыя для газэтнага чытача думкі губляюцца праз жаданьне аўтара напісаць пра ўсё адразу і няўменьне аргумэнтаваць іх лягічна.

**Наша Ніва**

незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3579. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 26.05.2004.

Замова № 3133.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а

**Наша Ніва** КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________________

______________________________

**Імя і прозьвішча** ______________________________

**Адрас, тэлефон** ______________________________

## Лета з «НН»

Першы чэрвеньскі нумар газэты выйдзе на 24 старонках. Сярод матэрыялаў — новае эсэ Ўладзімера Арлова, расповед пра дырэктараў саўгасаў, якія парабіліся фэрмэрамі, гутарка з будучым кандыдатам у прэзыдэнты. Купляйце і падпісвайцеся!